Не будзе каго хаваць ☞ 3


# Ніва

ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ

PL ISSN 0546-1960 NR INDEKSU 366714

http://niva.iig.pl
redakcja@niva.iig.pl

№ 28 (2617) Год LI Беласток, 9 ліпеня 2006 г. Цана 2,00 зл. (VAT 0%)


# У ЗУСе б'юць...

**Уладзіміру Герасімюку 70 год. Жыве ў Сухавольцах, непадалёк Кляшчэляў. У 1992 годзе пакарыстаўся законам аб ранейшых пенсіях і ўвольніўся з работы. Перайшоў на пенсію. З таго часу набавіўся ён клопатаў.**

— Не ведаю, дзе шукаць справядлівасці, — пачынае з сумам. — З шаснаццацігадовага ўзросту працую на гаспадарцы. Пасля смерці бацькі (памёр у 1960 годзе на туберкулёз у 51-гадовым узросце) я надалей абрабляў гаспадарку, плаціў належны падатак і ўзносы на сельскагаспадарчую пенсію. Рашэннем Цэнтральнай дырэкцыі ПКП у Варшаве ад 18 мая 1994 года прызначылі мне дабаўку за 11-гадовую працу на гаспадарцы, калі плаціў я складчыну г.зн. за 1977-1988 гг. У час апошняй выплаты выявілася, што мая пенсія паменшала. Я пачаў хадайнічаць у ЗУСе, каб высветлілі справу. За кожным разам прысылалі мне адзін і той жа адказ: „Атрымліваеце пенсію па законе, на аснове прад'яўленых дакументаў". Я з гэтым не пагаджаўся. Больш за дзесяць гадоў доўжыцца гульня ў жмуркі з ЗУСам: я пытаю, колькі мне належыцца прыбаўкі за працу на гаспадарцы, а гэтыя — „ўсё напісана ў рашэнні". 17 лістапада 2005 г. падаўся я ў Гайнаўку. У Аддзяленні ЗУС, у пакоі № 11, прывітала мяне маладзенькая панечка. Калі я выявіў мэту свайго візіту, служачая заявіла: „Справу раней разглядалі, пасылалі вам адказ. Іншага не будзе".

— А дзе тыя грошы, што за гаспадарку прыбавілі? — пытаю.

Чыноўніца зняла трубку тэлефона і набрала нумар. Калі размова закончылася, няветліва кінула ў мой бок: „Як маеце прыходзіць у такім відзе і скандаліць, дык спярша памыйцеся..." Я не мог сцярпець, што мяне „брудасам" назвала. Пачаў я чыноўніцу саромець, што не павінна так ставіцца да старэйшага, які можа быць ейным бацькам. Сведкам размовы быў святар з Зубач. Ведаў ён мяне, паколькі ён сам з Дашоў выходзіць.

— Не хвалюйся, Валодзя, — тлумачыў. — Усё добра скончыцца...

У кабінет зайшла загадчыца. У час размовы выявіла, што за працу на гаспадарцы КРУС даплачвае мне штомесячна па 120 зл. Затым прыбавіла:

— Можаце папрасіць, каб вам стаж працы ў Цэпэліі залічылі. Але з гэтым у Беласток трэба паехаць.

21 лістапада падаўся я на аўтобусе ў Беласток. Рашыў да дырэктара ЗУС пайсці. Сустрэліся мы выпадкова на калідоры. Калі я выявіў справу, з якой я прыехаў у ЗУС, суразмоўца сказаў ісці за ім. У пакоі № 218 папрасіў падняць мае дакументы з персанальнымі данымі і загадаў прыйсці ў кабінет начальніка Барбары Юркоўскай. Пані начальнік пазбягала размовы са мною, выходзіла без прычыны ў суседнія кабінеты. Тады я за ёй падаваўся. У ліфце хацела мяне аднаго пакінуць. Калі гэта не ўдалося, выклікала ахоўнікаў. Тыя папрасілі мяне пакінуць памяшканне ЗУС. Я пратэставаў, патрабаваў, каб начальнік падалася са мною да дырэктара і высветліла справу ў яго прысутнасці. Ахоўнікі разлаваліся ды накінуліся на мяне, як ястраб на курыцу, схапілі з абодвух бакоў за рукі. Прасіў я, каб мяне адпусцілі, бо нядаўна прайшоў я аперацыю прастаты. Мае аргументы не прымаліся пад увагу. Кінулі мяне ў ліфт, быццам палена на кучу дроў. У час падзення я разбіў галавою люстэрка ў кабіне. Асколкамі люстранога шкла пакалечыў твар і рукі. Меў разбіты нос. Пачаў клікаць дапамогу. На калідоры сабраўся натоўп. Працаўнікі аховы, нягледзячы на тое, што я абліўся крывёю, надзелі наручнікі. Адзін з іх запытаў мяне, ці не патрабую лекарскай дапамогі.

— Можаце мяне дабіць, — прасіпеў я праз зубы.

Неўзабаве прыехалі паліцэйскія, сказалі ахоўнікам зняць наручнікі, затым мяне павезлі на камісарыят на вуліцу Ліпавую. Пратакол пачаў саставляць адзін з паліцэйскіх, які перавозіў мяне, але прыйшоў следчы і заявіў, што ён зоймецца справай. У час допыту некалькі разоў званіў тэлефон. З рамовы я зразумеў, што прасілі следчага, каб адступіў ад саставлення пратакола. Пасля кожнага званка следчы то спыняў допыт, то пачынаў пісаць пратакол нанава.

На канец прачытаў мне пратакол і сказаў паехаць да лекара на вуліцу Бэма, каб зрабілі мне медыцынскае абследаванне. Адтуль дамоў я дабіраўся ў кампаніі Міхала Артышевіча і Мікалая Маркевіча з Чаромхі, з якім мы ў паравозным дэпо працавалі.

Пасля падарожжа я адчуваў сябе дрэнна, а вечарам вымушаны быў выклікаць хуткую дапамогу. Лекар выявіў высокі ціск крыві (230/130), зрабіў укол ды рэкамендаваў пайсці да сямейнага лекара дзеля далейшага лячэння. З амбулаторыі ў Бельску-Падляшскім атрымаў накіраванне ў шпіталь, але не прынялі мяне. Сказалі, што ціск крыві можна лечыць амбулатарыйным спосабам. Ад здарэння ў ЗУСе мінула больш за тры месяцы. З кожным днём я ўсё горш сябе адчуваў. Балела галава ды ціск крыві быў высокі. Пры канцы сакавіка гэтага года паралізавала мне ногі. Паклалі мяне ў спецыялістычны шпіталь у Харошчы на неўралагічнае аддзяленне. Пасля двухтыднёвай шпіталізацыі выпісалі дамоў. Стан здароўя крыху паправіўся. Але ненадоўга. Што і раз адчуваю боль галавы ды прыпамінаецца мне здарэнне ў ЗУСе. Падаў я заяву ў ЗУС з патрабаваннем абследаваць стан майго здароўя і ўстанавіць групу інвалідасці. Тэрмін вызначылі на 11 ліпеня. Што мяне чакае, цяжка сказаць. Лічу, што не прыпомяць мне мінулагодняй падзеі.

— А чым закончылася справа на паліцыі? — цікаўлюся.

— У снежні мінулага года з пракуратуры прыслалі мне паведамленне аб спыненні супраць мяне справы за знішчэнне люстэрка вартага 500 зл., паколькі ЗУС у Беластоку не падаў заявы аб учыненні шкоды. Наконт збівання мяне ахоўнікамі таксама справа была спынена „wobec braku interesu społecznego w kontynuowaniu ścigania z urzędu czynu ściganego z oskarżenia prywatnego", — закончыў аповед Уладзімір Герасімюк з Сухавольцаў, які намагаўся шукаць справядлівасці ў Беластоцкім аддзяленні ЗУС.

**Уладзімір СІДАРУК**

## Эксперымент ☞ 2

Віктар САЗОНАЎ

*Затым добрая навіна пра Беларусь. Аказваецца, беларускі рубель стаў вельмі моцны і хутка стане цалкам канвертуемай валютай. І нават (большага абсурду я не чуў), гэтаму працэсу не перашкодзіць увядзенне адзінай валюты з Расіяй і замена беларускага рубля на расійскі...*

## Віцэ-маршалак ☞ 2

Мацей ХАЛАДОЎСКІ

*Наколькі мне вядома, падляшскія самаўрадавыя ўлады маюць апрацаваныя мэты сваёй замежнай палітыкі прынятыя раднымі Сейміка. Выглядае на тое, што віцэ-маршалак Камінскі не разумее, што трансгранічнае супрацоўніцтва не з'яўляецца паняццем адарваным ад палітычнай рэальнасці і г.зв. дзяржаўных інтарэсаў. Таксама, дарэчы, не хоча разумець палітычных рэалій, у якія сам упісаўся...*

## Шчасная краіна ☞ 4

Міра ЛУКША

*На дзеянні звязаныя з Краінай шчаслівасці складваюцца розныя мерапрыемствы — ад выставак, пленэраў, сустрэч, прэзентацый, канферэнцый — да масавых імпрэзаў (канцэрты, кірмашы). У IV выданні праводзіліся яны 24 чэрвеня на Дворыску (Стары Двор) над Семяноўскім вадасховішчам з боку Тарнопаля, у Нараўчанскай гміне, а сабралі гасцей з некалькіх гмін — з „зарэчанскай" Міхалоўскай, Нараўчанскай, Гайнаўскай ды Беластоцкай...*

У Ласінцы ☞ 8

Аляксей МАРОЗ

*— Калі я вучылася ў Падставовай школе ў Ласінцы, таксама было стопрацэнтнае навучанне беларускай мовы. Ніхто і не думаў, што можа быць інакш. Цяпер бацькі таксама лічаць натуральным, што ўсе дзеці павінны хадзіць на заняткі беларускай мовы, — гаворыць настаўніца Люцына Рушук, якая вядзе заняткі ў нулявым і першым класах...*

## Таямніцы і чары ☞ 10

Тамара КУЧКО

*Добра памятаю жнівеньскія дні мінулага года, калі мы ў складзе дэлегацыі з пятнаццаці чалавек прыехалі ў Гайнаўку, каб прыняць удзел у праекце „Забытых таямніцаў чар"...*

9 770546 196000

# Эксперымент

У неўміручым творы „Сабачае сэрца" прафесар Праабражэнскі раіць маладому доктару Барменталю не чытаць перад ядой савецкай прэсы. Маўляў, ад яе вельмі кепска засвойваецца ежа.

— Дык другіх жа газет, акрамя савецкіх, няма, — здзіўлена кажа доктар Барменталь.

— Вось ніякіх і не чытайце, — адказвае прафесар.

Нешта падобнае я нядаўна пачуў, едучы ў грамадскім транспарце. Размаўлялі дзве жанчыны і, гэтак жа як прафесар Праабражэнскі, раілі адна другой не глядзець дзяржаўнага тэлебачання. Сцвярджалі, што ад тых перадач, якія там ідуць, вельмі моцна псуецца настрой і падымаецца ціск. Я вырашыў правесці эксперымент і цэлы дзень прысвяціць прагляду першага нацыянальнага канала. Настрой у мяне быў добры, ціск — як заўсёды. З самае раніцы я ўключыў тэлевізар і пад кубачак кавы стаў уважліва сачыць, што адбываецца на блакітным экране. Акурат пачыналіся навіны.

Напачатку я даведаўся як паспяхова рэалізуюцца ў Беларусі планы па пабудове аграгарадкоў і газіфікацыі Палесся, пра тое як дбаюць нашы чыноўнікі пра свой народ і што даходы насельніцтва за апошні час вельмі выраслі. Зараз яны складаюць каля ста сарака долараў на чалавека. Чамусьці даходы былі названы ў доларах.

Пасля пайшла благая навіна. Маладая дыктарка распавядала якія кепскія і каварныя амерыканцы. Да яе аповеду былі падключаны відэасюжэты, у якіх сцвярджалася, што Злучаныя Штаты Амерыкі даўно распрацавалі план, ці нават некалькі планаў, па авалоданні ўсім светам. Выступоўцы вельмі непакоіліся як на гэта адрэагуе Еўрасаюз і Расія з Беларуссю. Сцвярджалася, што мы павінны сарваць нахабныя планы імперыялістаў. Выступіў нават, па словах дыктаркі, „вядомы расійскі палітык уплывовай у Расіі камуністычнай партыі Генадзій Зюганаў". Той факт, што словы „ўплывовы палітык" ужываюцца толькі ў дачыненні да неграмадзян Беларусі мяне не здзівіў. Здзівіла тое, што таварыш Зюганаў па-беларуску сказаў больш слоў, чым дыктарка беларускага тэлебачання. А менавіта ён заверыў, што на нашу „незалежнасць і суверэнітэт, а таксама на беларускую мову, ніхто на пасягае". А пасля, ужо па-руску, заклікаў хутчэй аб'яднацца з Расіяй. Параіў браць прыклад з еўрапейцаў, якія, па словах лідэра расійскіх камуністаў, пабудавалі другі Савецкі Саюз, толькі назвалі яго чамусьці Еўрасаюзам.

Пакуль што закон жанру беларускага тэлебачання не парушаўся. Пасля добрай прыемнай навіны пра беларускую рэчаіснасць ішла кепская навіна пра заходні свет. Затым заклікі аб'яднання са сцвярджэннямі, што незалежнасць застанецца. Наступным паведамленнем мусіла быць штосьці кепскае пра краіны, якія некалі былі ў адзінай савецкай сям'і. І сапраўды. Такая навіна прагучала. Аказваецца, у Эстоніі не хапае памежнікаў і марскія межы гэтай прыбалтыйскай краіны ахоўваюцца толькі на два адсоткі. І ўсё таму, што там вельмі нізкія заробкі і няма аўтарытэту ў вайсковай службы. Не тое, што ў нас, дзе, каб патрапіць у войска, трэба прайсці складаны конкурс і нават не ўсе добраахвотнікі прымаюцца туды служыць.

Затым добрая навіна пра Беларусь. Аказваецца, беларускі рубель стаў вельмі моцны і хутка стане цалкам канвертуемай валютай. І нават (большага абсурду я не чуў), гэтаму працэсу не перашкодзіць увядзенне адзінай валюты з Расіяй і замена беларускага рубля на расійскі.

Пасля чаргавання добрых навінаў пра нас і кепскіх пра іх надышоў час распавесці як наш урад пра нас клапоціцца. Аказваецца, нядаўна ўвялі крымінальную адказнасць за свядомае парушэнне беларускай мяжы іншаземцамі. А яшчэ шлюб, узяты з грамадзянінам або з грамадзянкай Беларусі іншаземцамі з мэтай атрымаць беларускае грамадзянства будзе лічыцца несапраўдным. І правілы дарожнага руху зноў будуць мяняцца.

Затым са шчаслівым выразам твару дыктарка паведаміла, што 3 ліпеня ў Беларусі будзе святкавацца дзень незалежнасці. І што гэтае свята бярэ свой пачатак ад даты вызвалення Мінска саветамі ад немцаў. Будзе вялікі салют, якога яшчэ свет не бачыў, таму грамадзянам не рэкамендуецца туды падыходзіць блізка, каб іх не пакалечыла. Ну і ў сувязі з днём незалежнасці, зразумела, трэба было пагана расказаць пра беларускую апазіцыю, якая цалкам прадалася амерыканцам у той час, як пра незалежнасць дбаюць толькі тыя, хто выступае за інтэграцыю з Расіяй і ўвядзенне расійскага рубля.

Што казалі далей, я не ведаю, бо ў мяне падняўся ціск і сапсаваўся настрой. І не таму, што нехта хоча быць пры ўладзе вечна і вырашае за цябе, якое табе зрабіць жыццё, а таму, што такі вялікі штат прыслужнікаў гатовы кожны дзень плесці абы-што на ўсю краіну, абы толькі не згубіць цёплага месца. Цікава, ці добра яны спяць.

**Віктар САЗОНАЎ**

# Аблясенне ў Бельскім павеце

У Бельскім павеце лясы займаюць каля 27 тысяч гектараў. Найбольш лясістымі гмінамі з'яўляюцца Рудчанская (каля 15 тыс. га хвойна-ліставых лясоў) і Боцькаўская (4,8 тыс. га). Сярэдняя лясістасць павета роўная 19% і меншая за такі ж паказчык для Падляшскага ваяводства і цэлай краіны на, адпаведна, 10,4% і 9,2%. Дзяржаўныя лясы займаюць плошчу 11,2 тыс. га (41,8%), а прыватныя — 15,6 тыс. га (58,2% ад плошчы ўсіх лясоў у павеце). Гэтыя прапорцыі іншыя, чым для Падляшскага ваяводства, дзе плошча прыватных лясоў займае толькі траціну ўсяе лясное тэрыторыі. Публічныя лясы павета размеркаваны ў трох надляснічтвах: Рудка — 230 кубаметраў на гектар лесу, Нурэц — 206 і Бельск — 157. Амаль усе недзяржаўныя лясныя грунты Бельскага павета з'яўляюцца прыватнай уласнасцю і на іх тэрыторыі няма ніякіх прыродаахоўных аб'ектаў.

Як вынікае з дакументаў Бельскага староства, у 2004 годзе не былі апрацаваны ніякія праекты гаспадарчых дзеянняў у недзяржаўных лясах з прычыны змены назіральнага суб'екта тых лясоў (з ваяводы на старосту) і звязаны з тым брак сродкаў у павятовым бюджэце. У 2005 годзе са сродкаў павятовага бюджэту апрацаваны такія праекты для каля 600 га недзяржаўных лясоў.

У рамках выканання закону ад 8 чэрвеня 2001 года аб прызначэнні сельскагаспадарчых угоддзяў (нізкай якасці) пад аблясенне, рашэннем Бельскага староства (органа, які выдае пастановы) восенню 2002 года было аблесена 33,48 га грунтаў V і VI класаў. У 2003 годзе аблесена 70 га такіх жа грунтаў. З 2004 года аблясеннем нізкаякасных глебаў займаецца Агенцтва рэструктурызацыі і мадэрнізацыі сельскай гаспадаркі (АРіМСГ). У 2004 годзе аблясенні не праводзіліся, а ў 2005 годзе ў рамках Плана развіцця вясковых абшараў аблесена ў павеце 61,28 гектараў. У 2004-2005 гг. грунты аблясяліся ў рамках г.зв. Лясного фонду на бюджэтныя сродкі Генеральнай дырэкцыі дзяржаўных лясоў: у 2004 г. — 23,14 га і ў 2005 г. — 2,88 га.

Павятовае староства ў Бельску-Падляшскім будзе працягваць выплаты грашовых кампенсацый уладальнікам грунтаў за выключэнне тых грунтаў з сельскагаспадарчай вытворчасці для лесаводства на аснове прынятых рашэнняў. На выдаткі (уласныя задачы) у галіне лясніцтва выдзелена 352 261 зл., з чаго 207 518 зл. з АРіМСГ мае быць выдаткавана на „лясную гаспадарку", а рэшта — 144 743 зл. — на нагляд за лясной гаспадаркай.

У 2006 годзе, паводле дакументаў староства, выдаткі кранаючыя нагляду надляснічтваў за недзяржаўнымі лясамі будуць пагашацца з уласных прыходаў павета. Для гэтай мэты ў бюджэце прызначаны сродкі на 13 214 зл. (10%) большыя за мінулагоднія. Прадбачана сродкі вартасцю ў 10 тыс. зл. на выкананне спрошчаных планаў лесаабсталявання.

Задачы павінны выконвацца паводле ранейшых прынцыпаў, г.зн. шляхам дамоваў з надляснічтвамі ў Рудцы і Бельску. Нагляд за лясамі на тэрыторыі Боцькаўскай гміны будзе адбывацца шляхам кантрактаў Павятовага староства з кампетэнтнымі фізічнымі асобамі.

* * *

Лес, гэта сапраўдны прыяцель чалавека, які ў сваім жыцці не змог бы абысціся без дрэў і драўніны. Да поўнай спеласці расце ён вельмі доўга, таму трэба беражна пра яго дбаць і пастаянна насаджваць маладым дрэвастоем.

Часта бывае, што самасей, які вырастае на няўгоддзях без дапамогі чалавека, напр. на залежах пяску ці жвіру, можа падвяргацца самазнішчэнню. Гэтакім чынам выбывае многа дрэў і нездарма гаворыцца, што дрэвы паміраюць стоячы.

Да пачатку мінулага стагоддзя большасць людзей пражывала ў прыродным асяроддзі, прыгожым і карысным нават таму, што яно дазваляе аднаўляць сілы. Пасля, аднак, людзі сталі таўчыся ў вялікіх гарадах і паступова нішчыць прыроду. Правільна тады вырашана некаторыя тэрыторыі выдзяліць у запаведнікі; першы з іх, Йелаўстон у ЗША, узнік у 1872 годзе, наш Белавежскі нацыянальны парк — у 1932 годзе.

Не павінна нас здзіўляць тое, што наш Творца памясціў першую чалавечую пару ў чароўным парку Эдэме. Гэты парк быў вельмі абшырны, пра што сведчыць тое, што навадняючая яго рака раздзялялася на чатыры адгалінаванні і расло ў ім „усялякае мілавіднае і пажыўное дрэва" (Быццё, 1;8).

**Міхал МІНЦЭВІЧ**

**Вачыма еўрапейца**

# Віцэ-маршалак — сланом?

Асабліва з часу апошніх прэзідэнцкіх выбараў у Беларусі, у дачыненні да гэтай краіны, трэба дзейнічаць асцярожна.

У першую чаргу, калі гаворка аб кантактах з цэнтральнымі ўладамі, а таксама з арганізацыямі, якія непасрэдна ці хоць нават толькі ўскосна падтрымліваюць рэжым. Асабліва складаная тут сітуацыя польскіх мясцовых самаўрадаў, перш за ўсё памежных рэгіёнаў. Павінны яны мець асабліва добрае распазнанне ў беларускай рэчаіснасці, каб вызначыць ясныя прынцыпы супрацоўніцтва з адпаведнымі ўстановамі з другога боку мяжы: з кім размаўляць і аб чым.

У кантэксце замежный палітыкі Еўрасаюза, між іншым асабліва Польшчы, прадстаўнікі самаўрадавай улады вельмі лёгка могуць выступіць у ролі слана, які трапіў у краму з парцалянай. Такім сланом — прашу прабачэння за гэтую прыказкава-казачную фармулёўку — аказаўся ў апошні час віцэ-маршалак Падляшскага ваяводства, а заадно старшыня Падляшскай рэгіянальнай турыстычай арганізацыі Ян Камінскі. Запрасіў ён у Беласток на канферэнцыю „Інтэрнэтная сістэма турыстычнай інфармацыі і прамоцыі Польшчы" старшыню і віцэ-старшыню непрызнаванага Польшчай, а дзеючага з ласкі рэжыму Аляксандра Лукашэнкі Саюза палякаў Беларусі: Юзафа Лучніка і Эдварда Калошу. У выказванні для „Вспулчэснай газеты" адзін з чыноўнікаў польскага Міністэрства замежных спраў не скрываў:

— Гэта скандал. Такія паводзіны можна ацэньваць выключна ў катэгорыях правакацыі або татальнага няведання. Гэтае запрашэнне нязгоднае з палітыкай польскага ўрада і ўсяго Еўрасаюза.

Цікавым у гэтым усім з'яўляецца тое, што канферэнцыя была арганізавана на сродкі ЕС, значыць, так як і ўдзел у ёй старшыняў „легальнага" СПБ, Саюза, які быў прыцягнуты да супрацоўніцтва, каб — як сказаў віцэ-маршалак Камінскі — атрымаць еўрасаюзныя грошы.

— Мы не гуляем у міжнародную палітыку і персанальныя разборкі. Нас цікавіць перш за ўсё вельмі добрае прыгранічнае супрацоўніцтва, — кур'ёзна тлумачыўся „Вспулчэснай" віцэ-маршалак.

Наколькі мне вядома, падляшскія самаўрадавыя ўлады маюць апрацаваныя мэты сваёй замежнай палітыкі прынятыя раднымі Сейміка. Выглядае на тое, што віцэ-маршалак Камінскі не разумее, што трансгранічнае супрацоўніцтва не з'яўляецца паняццем адарваным ад палітычнай рэальнасці і г.зв. дзяржаўных інтарэсаў. Таксама, дарэчы, не хоча разумець палітычных рэалій, у якія сам упісаўся, ягоны калега з Ваяводскай управы Ян Сычэўскі (былы дэпутат Сейма ад СЛД; узнагароджаны Аляксандрам Лукашэнкам і — кажучы надта ж далікатна — памяркоўны ў адносінах да ягоных дзеянняў), старшыня Беларускага грамадска-культурнага таварыства. У Сейме, у час канферэнцыі „Правы нацыянальных і этнічных меншасцей на практыцы" наракаў ён два тыдні таму на адсутнасць (звычайную) на ўрачыстасцях беларускай меншасці прадстаўнікоў ваяводскіх і самаўрадавых улад:

— Калі гэта пастаяннае і ўпартае, дык гэта з'яўляецца праявай акрэсленых адносін да меншасці.

Мабыць, справа тут, між іншым, у мерапрыемствах арганізаваных БГКТ, пасля такой падзеі як Фестываль Беласток — Гродна, на якую БГКТ — пасля непрызнання рэжымам Аляксандра Лукашэнкі — не запрасіла ўлад СПБ з Анжалікай Борыс.

На канец вернемся да запрашэння: як стала, вядома, ні Юзаф Лучнік, ні Эдвард Калоша не атрымалі польскай візы.

— Шкада, што еўрасаюзныя грошы ідуць на такіх людзей як Юзаф Лучнік, — заявіла „Вспулчэснай" Анжаліка Борыс.

**Мацей ХАЛАДОЎСКІ**

# НЕ БУДЗЕ КАГО ХАВАЦЬ

**Дарога ў Тыльвіцу, што ад шашы між Заблудавам і Міхаловам, вымашчана брукам, дзе між камянямі нясмела прабіваецца на свет зелень. Значыць, дарога рэдка ўжываецца і праз нейкі час мо адзінай функцыяй таго бруку будзе замінка „зялёным лёгкім Польшчы". У самой Тыльвіцы тая траўка вырастае вышэй пасярэдзіне вуліцы, быццам бакі нейкі панк скасіў касою ў пакос.**

**У вёсцы руху не відаць, але на адным з агародаў бачу пажылую жанчыну і кіруюся ў яе бок. З недалёкай хаты выходзіць іншая кабета і я падаюся да яе, пытаю пра ейную вёску.**

А Тыльвіца не іншая, чым і большасць вёсак нашай Усходняй сцяны. Асталося тут пастаянна жыць каля пятнаццаці душ. Амаль усе старыя; малодшае толькі сыноўства мае суразмоўніцы, у якога дашкольнае дзіцятка. Той сын не мае пастаяннай працы і наймаецца то тут, то там, каму нешта паможа. Палі, што за вёскай, аброблены; абрабляюць іх выхадцы з Тыльвіцы, што жывуць у Беластоку. Мая субяседніца сказала мне, што тут адна пустая хата, але калі я прайшоўся далей па вёсцы, мне паказалася іх крыху больш. Ды і хат тых нямнога і сумныя яны, мабыць, ад старасці сваіх гаспадароў.

Пытаю пра дарогу ў Пяценку. Жанчына паказвае мне поплаў, у пачатку якога відаць каляіны драбнейшай траўкі, якія губляюцца далей. І яшчэ далей мае быць дарога сярод поля. Пабачыўшы расу на галёшах маёй суразмоўніцы, пытаю пра іншую дарогу. Ёсць і іншая дарога, ад скрыжавання за вёскай.

— І ад таго скрыжавання будзе дарога ў Патоку? — пытаю.

— Так, будзе.

Іду далей. На недалёкім агародзе чарговыя дзве жанчыны: адна поле, другая прыйшла абмяняцца тамашнімі навінамі. На адным з загончыкаў трускалкі; пытаю, ці мо ёсць маладыя. Але няма і невядома ці будуць, бо холадна і могуць не выжыць, пагніць. За вёскай абгароджаны невялікі вывадны крыж; вакол яго расліннасць амаль аднолькавая ў межах агароджы і навонкі яе.

Дарога ад Тыльвіцы ў Пяценку калдобістая, у каляінах трава меншая, бо яшчэ тае зямелькі, якую раней шымі гадамі трамбавалі вазы, мясцовы раслінны і жывёльны свет не ўспелі вярнуць да яе пачатковай узрыхленасці. Але ўжо настолькі тая трава задзірыстая, што хуценька напаўняе мой абутак расою.

Абшырныя могілкі на Пяценцы абгароджаны мурам, але з боку Тыльвіцы на іх бушуе толькі расліннасць. Мур той быў пастаўлены ў 1948 годзе, калі навакольныя вёскі былі людныя і, мабыць, прадбачвалася, што і могілкі таксама павінны быць буйныя, каб змясціць усіх чакальнікаў прыходу Страшнага суда. А апошнія не чакалі, толькі тлумна пакінулі пустымі свае зямныя хаты і прадбачаныя ім патойбаковыя дамавінні і хлынулі ў гарады, дзе складана знайсці і кватэру, і месца на могілках.

Побач могілак колішні жвіровы кар'ер, у які людзі выкідаюць сваё рукатворнае спадарожніцтва, што аджыло свой век; спяць тут вечным сном тапчаны, халадзільнікі ці часткі машын.

Магілы згуртаваныя вакол царквы. Як і на іншых могілках тут мірна сужываюць кірыліца з лацінкай.

*Царква ў Пяценцы*

Найстарэйшыя магілы вакол царквы — калі я чаго не прапусціў, — датаваныя міжваенным перыядам. На могілках хаваюць пакойнікаў Тапалянскага прыхода, які ахоплівае Малынку, Подваркі, Тыльвіцу, Гозную, Патоку і самыя Тапаляны. Штогадова 30 чэрвеня тут адбываецца агульны малебен.

Вярнуўся я пад Тыльвіцу і падаўся ў бок Патокі. Ад згаданай раней ростані жвіроўка толькі да лесу; у лесе дарога такая, як Бог даў. Калі яна вывела мяне з лесу, з левага боку паказалася толькі што ўзаранае поле, да якога араты адваліў і палову тае дарогі, пакінуўшы толькі адну каляіну. Пазней даведаюся, што зрабіў гэта, мабыць, адзін з братоў, якія між сабою судзяцца за скібу раллі. Далей, у полі, дарога з грунтавым насцілам, абкапаная равамі; з аднаго яе боку шмат валуноў, якіх багата на тамашніх палях.

*Каплічка ў Патоцы*

Ад газаправоднага ўчастка, на якім пастаўлена і вышка сотавай тэлекамунікацыі, зноў каля двухсот метраў жвіроўкі. Адтуль кідаецца ў вочы першая сядзіба Патокі, каля якой мноства пашавых цюкаваных валкоў. І шыкоўны дом, абсаджаны елкамі. Падумалася мне, што там жыве вялікі гаспадар з мноствам дабытку... Пасля высветлілася, што ў яго адна толькі карова, а пашу прадае некаму ад Нарвы. Набраў ён крэдытаў, якія цяпер дуюць ягоныя паручыцелі...

Перад Патокай дзве рэлігійныя паметкі. Праваслаўны каменны крыж, абгароджаны драўляным плотам, яшчэ супраціўляецца наступу бэзу і іншых раслінных змагароў за быт. Каталіцкая каплічка з фігуркай таксама абгароджана драўляным плотам, які ўжо здаўся наступу травы і сырасці. Калі яшчэ каталіцкія жыхары Патокі былі пры сілах, яны тым месцам апекаваліся, але тых сіл ужо няма. На цокале пад фігуркай высечаны паўкруглы надпіс: „Króluj nam Chryste zawsze i wszędzie, 1950 r." Пад надпісам выемка, быццам ад кулі; адкуль яна ўзялася, не ўдалося мне даведацца.

*Брама на могілкі*

На вуліцы пажылы чалавек абкошвае траву насупраць свайго панадворка; заводзім размову. Мой новы знаёмы з абурэннем расказаў, як ён хацеў купіць „Ніву" з беларускім календаром. Калі ён у кіёску, што па вуліцы Браніцкага ў Беластоку, спытаў пра патрэбную яму газету, прадаўшчыца паясніла яму:

— Ja takiego gówna nie sprowadzam.

У Патоцы жыве каля шасцідзесяці душ; раней людзей было намнога больш. Калісь хата майго суразмоўцы мела нумар за семдзесят, а цяпер той нумар упаў крыху за трыццаць. Асабліва многа людзей пакінула вёску ў геркаўскі час. Тады вяскоўцы бралі танныя крэдыты і будаваліся за іх у Беластоку.

Падаюся далей па вёсцы. Многа тут варот на панадворкі, праз якія здаўна ніхто не хадзіў, шмат ледзь находжаных. І за прастору вакол хат чалавек перастаў змагацца з расліннасцю. У адным з садоў заўважаю чарговы знак дэградацыі сялянскай спадчыны Патокі — платформу для хлапечых гульняў у час канікул, збудаваную на яблыні, на пладовым дрэве... Калісь людзі з пашанай ставіліся да Божых дароў, якія выраслі з зямлі. Цяпер прыгнятае мяне думка, што новыя людзі з вяковымі каранямі адыходзяць ад культу ў бескультоўе, у бескультурнасць.

Пасярэдзіне вёскі забыты мураваны пункт прыёму малака ды яшчэ больш жаласнае драўлянае пажарнае дэпо з часткова павырываннымі сценнымі дошкамі. Падлога паказвае, што калісь у тым дэпо адбываліся гучныя забавы.

Насупраць гэтых памятак даўніны пляц з высокімі дрэвамі. Пасярэдзіне пляца рэшткі падмурка, а на месцы ўяўнай будоўлі абгароджаны сінім драўляным плотам цэментны крыж. Месца выглядае так, быццам тут была раней нейкая царква, але надпіс на крыжы даволі агульны і пра мінулае нічога не згадвае.

Высвятляць загадку асаблівага месца падаюся ў найбліжэйшыя хаты. Па панадворках ходзяць куры, на ланцугах брэшуць сабакі. Але людской жывой душы не знаходжу. Крыху далей знаходжу мужчыну, які нічога не ведае, бо сам здалёк, ад Торуні.

Падаюся ў другі бок, углядаюся ў вокны, шукаю вяскоўцаў. У адным з акон заўважаю людскі сілуэт, заходжу на панадворак. У хату іду за дашкольнікам, які голасна паведамляе:

— Jakiś pan przyszedł!

У хаце хлопчыкавы бацькі і дзедка, які кажа, што раней у Патоцы была царква, якую ў першую сусветную вайну ўзарвалі немцы. Пра заўважаныя мною некалькі будынкаў для большай жывёлагадоўлі даведаюся, што іх гаспадары кінулі гэты занятак даўно. Згаданы раней пункт прыёму малака не працуе звыш дваццаці гадоў. Пасля яго закрыцця мясцовыя сяляне вазілі малако ў пункт прыёму гэтай сыравіны ў Тапалянах, але ад нейкага часу і той пункт закрылі. Цяпер тапалянскія сяляне прывозяць малако ў... Патоку! Бо тут адзін малады гаспадар трымае за дзесяць кароў, у яго ёсць бак, у які прымае таксама малако з суседняй вёскі. Мае суразмоўцы просяць знайсці яму жонку.

На канцы Патокі, што ад Геранімова, два панадворкі з роўна скошанай травой і каменнымі альпінарыямі; сюды заглядае новая мода. А ад Малынкі стаіць новы мураваны дом з грэчаскімі калонамі побач дзвярэй. Гэтыя моды на краях вёскі выглядаюць быццам бутафорыі, што ад вонкавых вачэй прыхоўваюць яе невясёлы цэнтр.

**Тэкст і фота**
**Аляксандра ВЯРБІЦКАГА**

## Гучыць музыка

Прыйшло лета і на гмінных пляцоўках зноў загучала музыка. 17 чэрвеня ў Нараўцы адбыўся чарговы агляд фальклорных калектываў Гайнаўскага павета пад назвай „У пошуках фальклору". Арганізатараў гэтай імпрэзы найбольш цікавяць старадаўнія, забытыя песні, так званы „аўтэнтычны" фальклор.

Не заўсёды ўдзельнікі конкурсу разумеюць рэгламент. Некаторыя спяваюць на сучасны лад у модных цяпер рытмах. Яны не праходзяць па конкурсе, хоць вельмі прыгожа выступаюць. Як правіла, выйграюць конкурс тыя калектывы, якімі кіруюць інструктары з прафесійнай музычнай падрыхтоўкай. У Нараўцы найлепшымі аказаліся „Цаглінкі" з Ляўкова і „Чыжавяне" з Чыжоў. Ужо шмат гадоў з „Цаглінкамі" працуе Мікалай Мяжэнны. Ён сам спявае і цудоўна іграе на баяне. Ігра Мяжэннага вылучаецца асаблівай выразнасцю і харавством. Яго баян перадае тую падсвядомую тугу, якая кранае сэрца і нясе светлыя пачуцці пра паўнату і імклівасць жыцця.

Гледачы любяць прыгожую добрую музыку і не шкадуюць апладысментаў. На гэты раз у Нараўцы гледачоў было нямнога. Стаяла спякотная сонечная пагода. Хто пайшоў на сеназбор, а хто адпачываў у цяньку.

**Мікалай ВАРАНЕЦКІ**

## Не вер каню ў дарозе

У 25 н-ры „Нівы" прачытаў я допіс Уладзіміра Сідарука п.з. „Не мела баба клопату" і задумаўся, што калега Валодзя даўся каб яго так ашукалі. Ён напэўна чытаў мой верш „Рэклама", змешчаны ў „Ніве" за 1996 год, у якім апісана шчырая праўда. У мяне ў хаце часта азываецца званок тэлефона і калі падыму трубку дык чую, што я ўжо нешта выйграў, толькі трэба пазваніць пад указаны імі нумар або ўплаціць адпаведную суму грошай, то тады ўжо атрымаю выйграны тавар. Не раз мне здарылася ад злосці мацюкнуць іх, але што з таго, калі там усё запісана на стужцы і бубніць, быццам з аўтамата; а ты, чалавеча, слухай і выконвай іх загад — то напэўна астанешся голы і босы. Аб гэтых хітрыках добра ведаюць нашы палітыкі з розных партыйных груповак, але гэта ім не перашкаджае.

**Мікалай ЛУК'ЯНЮК**

## Папраўка

Міхал Куптэль у „Ніве" № 22 ад 28 мая г.г. у артыкуле „Інспірацыя" піша няпраўду, што „Podręczny słownik polsko-białoruski" з 1962 г. не мае слова „inspiracja". Мае на старонцы 196: **inspiracj|a**-i ż інспірацыя -i ż. А ў „Польска-беларускім слоўніку" з 2004 г. пад словам **inspiracj|a** піша: ж. **1.** натхненне; **~a twórcza** ворчае натхненне; **2.** інспірацыя; штуршок, падгаворванне, падбухторванне; **z** *czyjej* **~i** па *чыім* падгаворванні (падбухторванні). Слова „інспірацыя" ёсць і ў „Беларуска-рускім слоўніку" з 1988 г. і ў „Русско-белорусском словаре" з 1953 г.

**Дзмітры ШАТЫЛОВІЧ**

# Шчасная краіна

**„Узнікненне Краіны шчаслівасці апіраецца на «Легенду аб Краіне» творцы Славянскага інстытута Стэфана Круля. Гэтая легенда сягае старажытных часоў, калі славяне былі задзіночаныя і кіраваліся ў жыцці прынцыпамі Мудрасці. Еднасць і прынцыпы станавілі аб адчуванні племянной годнасці. Якраз у Краіне шчаслівасці пануюць каштоўнасці аснаваныя на ўзаемнай Дабрыні, Красе і Любові. Каштоўнасці, праз якія знойдзем тое, што ў нас найлепшае і чым можам падзяліцца з іншымі.** Каб усмешка з нашых твараў не знікала і нашы дзеці мелі яе ўдосталь. Бо гэта яны ў будучыні будуць сілай, захаваюць культурную, рэлігійную адрознасць і дадуць магчымасць супрацоўніцтву", — як штогод прыгадваюцца словы Славаміра Галёнкі, жыхара Дубін, ініцыятара адраджэння „Краіны шчаслівасці" ў нашых баках. Арганізаваў ён разам з управамі Гайнаўскай і Нараўчанскай гмін ужо чатыры разы культурна-забаўляльныя мерапрыемствы дзеля прамоцыі рэгіёна, „каб павысіць атракцыйнасць жыцця тутэйшых жыхароў". Славян, як неаднаразова агаворваецца С. Галёнка, і за ім паўтараюць гэта вядучыя і спевакі з прыпушчанскіх мясцовасцей.

— Белавежская пушча гэта месца не толькі з цудоўнымі прыроднымі каштоўнасцямі і рэшткамі старажытнай пушчы, але, перш за ўсё, месца, дзе пераплятаюцца розныя культуры, мовы, рэлігіі, традыцыі, абрады. Месца, дзе гэтае вялізнае багацце траціцца з кожным годам. Некаторыя мовы і традыцыі ды абрады гінуць, — агульна выказваецца арганізатар вяртання ў краіну шчасця і гармоніі. — Яднаючаяся Еўропа гэта час істотных змен, якія з аднаго боку вядуць да большай адкрытасці, успрыняцця, зразумення, грамадскай спеласці, з другога — адкрытых межаў, транспартна-інфармацыйных аблягчэнняў і паўсюднай глабалізацыі, якая вядзе да занікання разнароднасці. Краіна шчаслівасці — гэта месца і час для шматракурсных дзеянняў, якія даходзяць да прычын, а не да вынікаў, якія памогуць пазбегнуць далейшаму страчванню каштоўнасцей, а якія давядуць да адраджэння гінучых культур. Хочам засеяць зерне паміж дзяцьмі і моладдзю, бо гэта яны ў будучыні будуць вырашаць аб лёсах малых айчын і іх багацці. Гэта месца і час для інтэгравання ўсіх зацікаўленых асяроддзяў, груп, арганізацый і асоб з мэтай супольных дзеянняў, усіх заклапочаных захаваннем як найбольшай разнароднасці ў рамках малой айчыны — рэгіёну Белавежскай пушчы. Стварэннем з гэтай малой айчыны для нас і для нашых дзяцей

*Славамір Галёнка, творца і інспіратар „Краіны шчаслівасці" першы раз у беларускім строі*

— Краіны шчаслівасці, дзе кожны зможа свабодна і згодна з уласнымі перакананнямі развівацца, дбаць аб традыцыі продкаў і годна жыць.

На дзеянні звязаныя з Краінай шчаслівасці складваюцца розныя мерапрыемствы — ад выставак, пленэраў, сустрэч, прэзентацый, канферэнцый — да масавых імпрэзаў (канцэрты, кірмашы). У IV выданні праводзіліся яны 24 чэрвеня на Дворыску (Стары Двор) над Семяноўскім вадасховішчам з боку Тарнопаля, у Нараўчанскай гміне, а сабралі гасцей з некалькіх гмін — з „зарэчанскай" Міхалоўскай, Нараўчанскай, Гайнаўскай ды Беластоцкай. Можна было шмат даведацца пра рэгіён, пазнаёміцца з турыстычнымі і кулінарнымі каштоўнасцямі рэгіёна. Падрыхтаваны былі віктарыны па ведах пра не толькі Нараўчанскую гміну і яе людзей (прымалі ў іх удзел дзеці і дарослыя), якія вельмі добра падрыхтавала інструктарка Гміннага асяродка культуры Кацярына Бяляўская. Спонсарамі былі Нараўчанская гміна, ГОК, дэпартамент сельскай гаспадаркі Ваяводскай управы ў Беластоку, агратурыстычнае таварыства „Зубр" у Нараўцы, Каапературыўны банк у Браньску ды Таварыства славян. Гэтых славян шукаў ад самога пачатку ансамбль „Дыялект" з Гайнаўкі (*„Gdzie są ci Słowianie, gdzie oni są?"*), які вельмі прыгожа праспяваў усе беларускія песні са свайго рэпертуару. На сцэне заспявалі яшчэ беларусы з Гродна ды адна французанка. Гледачы горача ўспрынялі калектыў „Нараўчанак", якія моцна трымалі беларускі гонар, з караваем „высокім, цыцатым", які мусіў выкупіць за грошы спонсараў сват, якраз Славамір Галёнка, першы раз у жыцці апрануты ў беларускую кашулю ды перавязаны прыгожым вышываным ручнікам (каравай быў перададзены ў рукі спонсару — войту Мікалаю Павільчу). Па-за месцам над возерам адбыўся веласіпедны рэйд па пушчанскіх вёсках ды ганчарская майстэрня, якая праводзілася ў Старым Ляўкове. Гледачам даспадобы былі таксама ласункі, тыповыя як на ўсіх фэстах (цукровая вата, каўбаскі...) ды смакоцце, якое прадстаўлялі гаспадары „Бора-Здрою" Барыс і Люда Казлоўскія з Новага Ляўкова (мёд, хлябы, кашанка і штосьці для... духа). З мастакоў паявіўся м.інш. Марэк Блашак з Беластока ды можна было заказаць партрэт (за „трыццаць злоты", „сорак злоты" або... „тры ночы") у іншага, а таксама ляўкоўскія дзеткі, якія паказалі свае гліняныя вырабы. Шукалася таксама звяроў, бо мелі быць паказаны — урэшце ж Краінай шчаслівасці кіраваў быў у Славяншчыне Вялес — „скотій бог", ды адзінымі звярамі, апрача рыбаў у возеры (стаяла таблічка, што купацца тут нельга) былі птушкі ў старадворскім бары ды дварнякі, што прыбеглі за роварамі ды мястовыя цюцікі, што прыехалі з гаспадарамі на аўто. Толькі што ў Славяншчыну ў тую Краіну шчаслівасці — Навію, аддзеленую ад Явіі вадой — у сапраўдасці ніхто жывы трапіць не мог.

**Міра ЛУКША**

# Помнік Купалу ў Гайнаўцы

У лютым у Беларускім музеі ў Гайнаўцы адкрылася выстава „Малюся я небу, зямлі і прасторы...", прысвечаная Янку Купалу. Экспазіцыя, падрыхтаваная Дзяржаўным літаратурным музеем Янкі Купалы, трапіла ў Гайнаўку дзякуючы перш за ўсё паслу Рэспублікі Беларусь у Варшаве Паўлу Латушку. На вернісажы пасол чарговы раз публічна звярнуўся да бурмістра горада Анатоля Ахрыцюка з прапановай устанавіць у Гайнаўцы помнік народнаму песняру Беларусі Янку Купалу. Сабраныя ў музеі жыхары Гайнаўкі, школьная моладзь і настаўнікі, работнікі ўстаноў прапанову пасла ўспрынялі бурнымі апладысментамі, выказваючы такім чынам надзею на яе здзяйсненне. Помнік Янку Купалу ў Гайнаўцы быў бы доказам нашай павагі і любові да літаратурнай спадчыны беларускага класіка, творчасць якога дапамагае нам захаваць сваю нацыянальную свядомасць.

За чатыры месяцы выставу наведала школьная і ліцэйская моладзь Гайнаўкі і Гайнаўскага павета, работнікі, пенсіянеры. Я часта размаўляю з наведвальнікамі музея на тэму мэтазгоднасці ўстанаўлення помніка Купалу ў Гайнаўцы. Паверце, ніводзін з маіх суразмоўцаў не паставіўся да гэтай прапановы адмоўна. Наадварот, многія ўказвалі месца, дзе мог бы стаяць помнік, напрыклад, парк ля амфітэатра, а сам амфітэатр прапанавалі назваць імем класіка. Гэтыя прапановы, на маю думку, трапныя.

Аднак бурмістр да гэтай пары маўчыць. Калі б перашкодай аказаліся грошы, а менавіта іх нястача ў гарадскім бюджэце, думаю, дапамогу гораду аказаў бы братні народ Беларусі. Уперад, шчыльнымі радамі!

**Віктар БУРА**

# Абмен вопытам

**Апошнім часам на Гайнаўшчыне штораз часцей ладзяцца мерапрыемствы з удзелам арганізацый і ўстаноў з Польшчы і Беларусі. Новыя магчымасці выкарыстоўваюць настаўнікі Комплексу спецыяльных школ у Гайнаўцы, якія рэалізуюць праект „Няхай свет людзей інтэлектуальна абмежаваных становіцца нармальным". З 22 па 24 чэрвеня гасцявалі ў іх настаўнікі Школьна-выхаваўчага асяродка для інвалідных дзяцей ў Бучамлі (Камянецкі раён), якія з'яўляюцца партнёрамі праекта.**

— У час рэалізацыі праекта мы намерваемся абмяняцца вопытам з дзейнасці школ і ўстаноў у карысць інвалідных асоб у Гайнаўцы і Бучамлі. Станоўчы і адмоўны вопыт у нас розны, але мы маем намер зрабіць з яго вывады і дзейнічаць так, каб наша работа была як найбольш эфектыўнай і спрыяла асобам з інтэлектуальнай дэфектыўнасцю. Будзем намагацца працаваць так, каб іх свет станавіўся штораз больш нармальным. Я маю надзею, што наш праект і ўвядзенне новых метадаў актыўнасці спрычыніцца да павышэння якасці працы абедзвю школ, — кажа каардынатар праекта Люцына Ваўрашук з гайнаўскай школы.

Апошнім часам у Гайнаўцы ўзніклі ўстановы, якія працуюць у карысць людзей з інтэлектуальнай дэфектыўнасцю. У рамках праекта наведалі іх бучамлянскія настаўнікі, якія працуюць з падобнымі асобамі з Камянецкага раёна. Госці заехалі ў Павятовы асяродак успамагання, якім карыстаюцца, між іншым, выпускнікі спецыяльнай школы, Асяродак узораў мэблі для інвалідаў і Гайнаўскія варштаты тэрапіі.

Комплекс спецыяльных школ у Гайнаўцы, які не так даўно святкаваў 40-годдзе сваёй працы, займаецца адукацыяй дзяцей і моладзі з інтэлектуальнай дэфектыўнасцю. Вучыцца тут 56 чалавек ва ўзросце ад 8 да 24 гадоў. Маладыя людзі займаюцца ў школе і дома на падставовым, гімназічным і звышгімназічным узроўнях.

— Мы ў школе асаблівую ўвагу звяртаем на ўсебаковае развіццё нашых дзяцей. Раней вучылася ў нас многа асоб з лёгкай дэфектыўнасцю, а зараз штораз больш нашых вучняў з памяркоўнай і значнай дэфектыўнасцю, — гаворыць дырэктар Комплексу спецыяльных школ у Гайнаўцы Ірэна Зін. — Нашы вучні добрыя, любяць сваіх настаўніц. Яны патрабуюць любві, чуллівасці, стараюцца быць паслухмянымі і падзеляцца апошнім з іншымі.

У Комплексе школ н-р 4 у Гайнаўцы (іншая назва школы) дзейнічае вакальна-танцавальны калектыў і тэатральны гурток. Вучні выступілі з тэатральна-музычнай часткай перад гасцямі з Беларусі і кіраўнікамі гайнаўскіх устаноў, якія супрацоўнічаюць са школай. Дзеткі і моладзь дэкламавалі вершы, спявалі песні і танцавалі разам з настаўнікамі.

Вельмі цяжка было расставацца дзеткам з настаўнікамі ў час урачыстасці заканчэння навукі ў спецыяльнай школе, на якой прысутнічалі беларускія педагогі. Вучні плакалі, шкадуючы, што ў час доўгіх канікул не будуць сустракацца са сваімі настаўнікамі. Слёзы паказаліся таксама ў вачах некаторых педагогаў, якія зжыліся са сваімі выхаванцамі. Дырэктар школы паказвае мне вялікія, прыгожа аздобленыя класныя кабінеты і размаляваны школьны калідор. Школа павінна ўводзіць вучняў у радасны настрой.

*Госці з Беларусі з гайнаўскімі вучнямі і настаўніцамі*

— Вучацца ў нас дзеці лекараў, настаўнікаў, афіцэраў, бо дзеці з інтэлектуальнай дэфектыўнасцю родзяцца ў розных сем'ях. Найчасцей крыніцу дэфектыўнасці нашых вучняў трэба шукаць у генетычных абумоўленасцях. Рэзультат нашай работы відаць пасля 5-10 гадоў. Аднак варта многа працаваць, каб вынікі былі заўважальныя, — кажа дырэктар Ірэна Зін. — Некаторыя бацькі не хочуць высылаць да нас дзяцей з разумовай дэфектыўнасцю і настойваюць, каб вучыць іх у агульнаадукацыйных школах. Яны не разумеюць, што індывідуальную работу ў класах, дзе вучыцца па 30 дзетак, весці цяжка. У нас класы па 6-8 асоб і ёсць магчымасць індывідуальна і паспяхова працаваць з вучнямі.

Госці з Камянецкага раёна былі запрошаны ў Беларускі музей, дзе знаходзіцца выстаўка мастацкіх прац дзяцей Комплексу спецыяльных школ у Гайнаўцы. Наведалі яны Самаўрадавы садок н-р 3 у Гайнаўцы. Дашкольнікі выступілі там з беларускімі вершыкамі і песнямі. Педагогі з Беларусі пабывалі таксама ў гайнаўскіх і белавежскіх установах з ліфтамі і спецыяльнымі лесвіцамі для інвалідаў. Многаму маглі навучыцца бучамлянскія настаўнікі ў час мастацкіх, танцавальных і тэатральных заняткаў, якія праходзілі ў спецыяльнай школе. Педагогі з Гайнаўкі і Камянецкага раёна супольна рыхтавалі каляровае сцэнічнае афармленне. Іншая група настаўнікаў пераклала на беларускую мову тэкст прадстаўлення „Трое парасят", якое асабліва спадабалася гасцям. Заняткі закончыліся прадстаўленнем і танцамі перад настаўніцкай публікай.

— Супольныя заняткі з вашымі педагогамі былі арыгінальнымі і можна было многаму навучыцца. Усе настаўнікі па-мастацку падыходзілі да працы, — заяўляе Васіль Ішчук, намеснік дырэктара Бучамлянскай школы. Інфармуе ён, што ў яго школе і цэлым асяродку больш складана працаваць з моладдзю з інтэлектуальнай дэфектыўнасцю, чым у Гайнаўцы.

— У нас меншыя сродкі на працу і ўмовы больш складаныя, — дабаўляе настаўнік з Беларусі.

— Мы будзем у сябе ставіць спектакль пра парасятак і вучыць вашым танцам, — кажа настаўніца з Беларусі Ірына Карповіч.

У Бучамлянскай школе вучыцца 107 дзяцей, якія жывуць у мясцовым інтэрнаце. Вучні актыўна прымаюць удзел у аглядах мастацкай самадзейнасці і спартыўных спаборніцтвах, дабіваючыся шматлікіх поспехаў. У 1992 годзе маладыя людзі з асяродка прымалі ўдзел ў Параалімпіядзе ў Мадрыдзе. У 1995 годзе школьныя каманды па настольным тэнісе і валейболе прымалі ўдзел у спартыўных спаборніцтвах у Злучаных Штатах Амерыкі. Дзеці з Бучамлянскай школы выступалі з мастацкай праграмай у амерыканскіх гарадах і сустрэліся там з прыхільнай ацэнкай. Поспехаў могуць дабівацца, дзякуючы высокім кваліфікацыям педсавета (у школе працуюць ажно 44 педагогі і прыблізна столькі ж тэхнічных работнікаў). Праект прадбачвае, што гайнаўскія настаўнікі наведаюць Бучамлянскую школу восенню гэтага года і тады пазнаёмяцца з працай школьнага асяродка.

— Наш праект фінансава падтрымліваецца Польска-амерыканскім фондам вольнасці ў рамках Праграмы перамен у рэгіёне RITA. Мэтай праграмы ёсць, між іншым, садзейнічанне дэмакратычным пераменам у краінах былога ўсходняга блока шляхам выкарыстання вопыту Польшчы, — інфармуе каардынатар праекта Люцына Ваўрашук.

**Аляксей МАРОЗ**

*Каб паказаць на беларускай мове прадстаўленне „Трое парасят", настаўнікі выканалі сцэнічнае афармленне, пераклалі тэкст з польскай мовы*

## Сейбіты вечнага

Вечарам 15 чэрвеня ў адным з залаў Музея беларускай культуры ў Гайнаўцы было нешматлюдна, але па-сяброўску ўтульна і хораша. Адбывалася прэзентацыя кнігі айца Рыгора Сасны і Дарафея Фіёніка „Шчыты — дзеі вёскі і прыхода".

Пакуль на экране перад прысутнымі праходзілі дакументальныя кадры хронікі жыцця вёскі сярэдзіны мінулага стагоддзя, у памяшканні стаяла ўрачыстая цішыня.

Затым слова ўзяў айцец Рыгор. Ён пазнаёміў прысутных з этапамі работы над кнігай, з матэрыялам, які давялося агораць у часе працы, з традыцыямі і побытам жыхароў вёскі Шчыты і праваслаўнага прыхода.

Выданне пабудавана на фактычным матэрыяле з прыцягненнем дакументаў і фотаздымкаў. Старонкі кнігі здзіўляюць глыбінёй даследавання жыцця вёскі, а часам выклікаюць настальгічны сум па далёкіх часах дзяцінства, якое цесна было звязана з вёскай. У чарговы раз аўтары пакараюць мяне глыбінёй свайго розуму і чысцінёй памкненняў. Кранае іх любасць да мастацкага слова, нацыянальнай даўніны і гісторыі. Лішні раз пераконваюся ў тым, які добры вынік дае гарманічнае спалучэнне творчай задачы і літаратурнага таленту.

Чалавек апантаны (у самым станоўчым сэнсе слова), айцец Рыгор захапіў сваім выступленнем не толькі слухачоў шаноўнага ўзросту, але і студэнцкую моладзь, якая прымала ўдзел у імпрэзе.

Дарафей Фіёнік слушна дапоўніў галоўнага выступоўцу. Склалася ўражанне, што гэты творчы тандэм яшчэ доўга будзе радаваць нас сваімі здабыткамі. Абодва — гарачыя прыхільнікі беларускіх традыцый, патрыёты сваёй Айчыны, захавальнікі духоўных скарбаў даўніны і проста неабыякавыя да ўсяго людзі. Абодвух вылучаюць бескарыслівасць, даверлівасць, пачуццё гонару за свой народ і гарачая любоў да чалавека працы.

**Тамара ЛАЎРАНЧУК**
**Гайнаўка — Высокае**

## 100 гадоў

У 1906 годзе, 100 гадоў назад, нашы продкі будавалі чыгуначную лінію Седльцы — Ваўкавыск. Яна, між іншым, праходзіць па тэрыторыі Нараўчанскай гміны. Не так даўно пасажырскі рух з Гайнаўкі ў Семяноўку спыніўся. Радыкальна змянілася жыццё. Грамадзянам выгадней ехаць аўтобусамі ПКС або ўласнымі аўтамашынамі. Ніхто не хоча хадзіць некалькі кіламетраў да чыгуначнай станцыі. Варта помніць, што калісьці чыгунка была велізарным дасягненнем, бо адчыніла людзям акно на свет. Асабліва ў пасляваенны час людзі карысталіся чыгункай, бо праезд каштаваў мала, а іншая камунікацыя не існавала. З часам ехаць стала выгадней. Калі гміны пабудавалі цвёрдыя дарогі, тады ПКП прайграла з ПКСам і лакальныя чыгуначныя маршруты закрываюцца. Такая сённяшняя рэчаіснасць.

**Мікалай ВАРАНЕЦКІ**

Ганна Кандрацюк (zorka@niva.iig.pl)

зорка

для дзяцей і моладзі

# Гражынка і Грак

- 31 -

*Ну і ўсё — Гражынка ўсё ж выбралася ў горы, мама паехала з татам у адпачынак, а Грак застаўся з бабуляй у хаце. Ды і ў бабулі вольны час — на працу не ідзе, адно ў агарод капацца, вяртаецца адтуль стомленая ды загарэлая.*

*— Гэта вы з-за мяне засталіся дома? Я ж казаў Гражынцы, хай мяне возьме ў горы; памагу ёй несці заплечнік. Дарэчы, маглі б і вы паехаць. Мне пакінуць сухую ежу, ваду... Раніцай адчыніў бы фортачу з гаплючка, паляцеў бы на вуліцу, наеўся б чаго... цьффу... жывога, папіў бы расы... — Граку ад хвялявання расінка, бы гарошак, застрагла ў горле. — Увечары вярнуўся б, зачыніў зашчапку за сабою... А вы гулялі б сабе на волі, кожны ў сваім баку.*

*— Ты ж сам бачыш, што амаль не плачаш. Як жа ж цябе я пакіну! Не турбуйся, у агародзе таксама ёсць занятак. Дарэчы, там зусім цікава. Не толькі я праводжу кавалак лета на ўчастку. Шмат людзей корпаецца ў зямлі, праполвае, палівае, падвязвае, збірае плады... Вось памідорыкі свежыя, радысачка... Неўзабаве тата з мамай вернуцца, і тады мама пасядзіць з табою. А ў агародзе да таго часу ўсё парасце! Дарэчы, мне там зусім не нудна. Можа, выберашся са мной на канцэрт?*

*— Куды, у агарод?! А што, птушачкі спяваюць?*

*— Ну, птушачкі, вядома, але і канцэрт будзе пад вечар. Мае сябры выступаць будуць.*

*— Вашы сябры-артысты?*

*— Ды не, проста так, спяваюць. Сам ты ж таксама паспяваць любіш.*

*— О, та-а-ак, хор-р-р-р-аша мне часам удаецца!*

*— А ж не мастак ты, а...*

*— Аматар-р добр-р-рай музыкі.*

*— А мае сябры-пенсіянеры таксама аматары. Толькі ты ім не падпявай, бо ў танацыю можаш не трапіць, а яны — самадзейнікі-аматары, яшчэ возьмуць і разгубяцца...*

*Ускокнуў Грак у бабулін кошык з векам, праехаўся ў цяньку на ўчастак. Думаў, палятае ўволю над градкамі, ды толькі сядзеў ды зяпаў на ганку доміка, хаваючыся ад сонца. А ўвечары не стрываў ды пацягнуў з усімі на ўсё горла „На зялёнай Укр-р-р-раіне!" І ніхто не збіўся з танацыі!*

**Міра ЛУКША**

# Калінавыя канікулы ў Залуках!

Фота ГАННЫ КАНДРАЦЮК

*Навучэнцы беларускай мовы*

Канец школьнага года выпаў у спякотны пачатак лета. У Залуках, што на Гарадоччыне, рыхтаваліся да „Купалля". Мы завіталі ў школу, хоць вабілі чыстая рачулка і квяцістыя лугі.

— Наша „Калінонька" таксама выступіць на свяце, — заяўляюць настаўніцы. У згаданым гурце спявае сем дзяўчат з чацвёртага па шосты клас. У вёсцы ёсць яшчэ два беларускія калектывы — „Каліна" і „Калінка" — усе тры гурты ўзніклі па ініцыятыве Валянціны Паплаўскай. Наймалодшыя спявачкі пераняялі нават касцюмы ад „Калінкі". Раней, калі яшчэ не было святліцы (зараз яна завецца *Згуртаванне Залукі над Супраслю*), старыя і маладыя праводзілі рэпетыцыі ў школе.

— У час канікулаў правядзем неабходны рамонт, — кажа Катажына Філіпяк, дырэктар школы. У Залуках 46 школьнікаў, настаўнікі ведаюць сваіх выхаванцаў па імені.

— Ці нешта змянілася, калі ў вас зноў пачалі вывучаць беларускую мову? — пытаю.

— Нашы вучні ездзілі ў Беласток на дэкламатарскі конкурс, — кажа дырэктар.

Сапраўды, пасля доўгага перапынку Залукі зноў у шырокай кампаніі завіталі на „Роднае слова". На раённы этап у Беласток прыехалі Бася Філіпчук, Кшысь Літвін, Аня Паплаўская, Моніка Філіпчук, Раксана Мойсак, Марыюш Філіпчук, Магдаліна Станкевіч, Андрэй Станкевіч. Пасля, Кжысь Літвін і Бася Філіпчук выступалі яшчэ ў Нараўцы, на цэнтральным аглядзе. (Шкада, што ў час урачыстага заканчэння школьнага года яны не атрымалі беларускіх грамат!). Сваю прысутнасць заявіла таксама „Калінонька" на аглядзе беларускай песні ў Бельску-Падляшскім.

Цікавімся, вядома, і роднай мовай, якая адрадзілася цягам апошняга года. На ўрокі, якія вядзе Альжбета Колтак, запісалася 11 асоб. Сёлетнія выпускніцы Раксана Мойсак і Моніка Філіпчук не мелі сумненняў наконт далейшай адукацыі ў родным слове:

— У Гарадку таксама буду хадзіць на ўрокі беларускай мовы, — кажа Раксана. Моніка паўтарае яе словы.

Цяжка ўявіць канец школьнага года без мора кветак і ўзнагарод. Так было і ў Залуках. У школе шэсць вучняў атрымалі пасведчанні з бел-чырвонай палоскай. Гэта будучыя пяцікласнікі: Ася Мінчук і Барташ Лех, ды шасцікласнікі: Пётр Герасімюк, Андрэй Станкевіч, Ева Філіпчук і Яцак Антановіч. Былі ўзнагароды за актыўнасць у чытанні (трэба было прачытаць больш за 50 кніжак), за экалагічную і грамадскую дзейнасць, а Матэвуш Аўсянюк за матэматычны конкурс „Кенгуру", у якім заняў 54 месца ў Беластоцкім павеце (на 1 200 удзельнікаў).

Настаўніцы і вучні дзякавалі таксама супербацькам, якія цягам мінулага года дапамагалі школе. Мамы і таты прыйшлі на ўрачыстасць таксама з каляровымі букетамі.

Фота ГАННЫ КАНДРАЦЮК

*Катажына Філіпяк (другая злева) і Івона Лех віншуюць выдатнікаў*

**ЗОРКА**

# Найцікавейшыя знаёмствы!

*Раксана (першая справа), Моніка (трэцяя справа) з сябрамі шасцікласнікамі*

— Якія ў вас планы на канікулы? — пытаем у Раксаны і Монікі з Залук. Дзяўчаты спяваюць у беларускім гурце „Калінонька". У Залуках над ракой Супрасль (Гарадоцкая гміна) ёсць аж тры спявачыя гурты: „Каліна", „Калінка" і „Калінонька". У першым калектыве спяваюць бабулі і мамы, у другім — гімназісткі і ліцэісткі, у трэцім — дзяўчаты з Пачатковай школы.

Раксана Мойсак: — У жніўні я паеду на летнік у Ястарню, астатні час правяду ў вёсцы.

Моніка Філіпчук: — Мае канікулы будуць звычайныя, я нікуды не збіраюся і ўвесь час правяду ў сваёй вёсцы.

— Вы спяваеце ў „Калінонькі", ці часта выступаеце перад публікай, ездзіце з канцэртамі?

Раксана: — Мы толькі пачынаем, але выступалі ўжо ў Ялоўцы і Гарадку. Заўтра заспяваем у Залуках на „Купаллі".

— Што найбольш памятаецца пасля канцэртаў?

— Моніка: — Найцікавейшыя знаёмствы, асабліва калі прыязджае моладзь з Беларусі. Мы заводзім знаёмствы, пасля чакаем наступных сустрэч і забавы пры беларускай песні.

— Вы ходзіце на беларускую мову?

Раксана: — Так. Аднак у нас складаная сітуацыя. Я мела магчымасць вывучаць беларускую мову толькі ў трэцім і шостым класах. Раней у нас не было гэтага прадмета.

— Чаму?

Моніка: — Не было настаўніцы.

— Зараз у вас маладая настаўніца, ці падабаюцца ўрокі якія вядзе спадарыня Альжбета Колтак?

Раксана: — Усё, што робім на ўроках беларускай мовы, захапляе мяне. Казкі, вершы, песні. Гэта файныя заняткі.

— Ты, Раксана, ад верасня ідзеш у Гімназію ў Гарадок. Ці далей будзеш вывучаць беларускую мову?

Раксана: — Вядома!

Моніка: — Я таксама.

— А якія песні ваша „Калінонька" заспявае на „Купаллі"?

Раксана і Моніка: — Гэта будуць „Рыбакі" і „Добры вечар".

— Мы таксама жадаем, каб добра спявалася „Калінонькі".

**ЗОРКА**

*„Калінка" — дзяўчаты перадалі касцюмы „Калінонькі"*

# Тры Паўліны і Паўл

Разам з канікуламі прыйшла летняя жара. Ужо ў апошні дзень перад заканчэннем школьнага года нашы сябры выправіліся на гарадское вадасховішча купацца і загараць. Таксама ў апошні дзень, замест, як кожны год, наведаць піцэрыю, рушылі яны над ваду. У сумках, разам з пасведчаннямі, ляжалі каляровыя купальнікі.

— Ты, Паўлік, быццам певень у нашай бандзе, — заўважыла Паўліна Ш.

— Я — леў! — паправіўся Паўл.

Сапраўды, ён адзін і чатыры сяброўкі выправіліся на пляж. Спачатку меў ехаць таксама Марцін, але ў яго не было настрою — дэпрэсію навялі ацэнкі на пасведчанні. Марцін вяртаўся дахаты на мяккіх нагах у спадзяванні сямейнай буры.

— Давайце купім папяросы! — ні адтуль, ні адсюль, кінула Іголка.

— Ты што?! — вырачылася ад нечаканасці Паўліна Б. — Навошта нам папяросы?

Сапраўды, сябры зірнулі адзін на аднаго і было ясна што ніхто не любіў цыгарэт і не курыў іх.

— А што мы *пакемоны* якія? — пацінула плячыма Паўліна Ш.

Яе заўвага трапіла на грунт зразумення. У гімназіі курылі папяросы адно найгоршыя вучаніцы, а курцы з ліку хлопцаў мелі памаляваныя на жоўты колер валасы і іх празывалі „курчакамі". Іх прыклад знеахвочваў больш чым усялякія пагрозы і гутаркі пра здароўе.

— То можа „броўца" купім, — падхапіў тэму Паўл.

— Піва? Не! Ці нехта з нас любіць піва? — Паўліна Б. паставіла пад развагу пытанне-выклік.

Не было аматараў хмельнага напою.

Аднак думка пра „дарослае" заканчэнне школьнага года іх не пакідала. У канцы ўсе пагадзіліся, каб купіць салодка-кіслае піва і нашы сябры сталі разважаць адно пытанне: менавіта, хто з іх пойдзе ў краму. Ніхто не хацеў ісці сам. Не дапамагла нават жараб'ёўка, бо ў яе выніку задача выпала на долю Паўліны Ц., найменшай ростам асобы ў кампаніі.

— То пойдзем усёй бандай, — заявіў аўтарытэтна Паўл.

— Тады пайшлі, — грымнулі дзяўчаты.

У краме яны наткнуліся на трэцякласнікаў са сваёй школы. Яны таксама збіраліся купіць піва, за што невыносна лаяў і сароміў іх прадавец. Палохаў паліцыяй, дырэктарам школы, нават „папраўчакам". Маладзёны сапраўды спалохаліся і ў няславе пакінулі краму.

Дзядзька за прылаўкам, быццам на ўласны ўжытак, яшчэ доўга крычаў наўздагон нязгдзейсненым пакупнікам. У канцы прыкмеціў нашу цудоўную пяцёрачку:

— А вам, мілыя, чаго трэба? — спытаў ужо лагодным голасам.

— А нам... — Паўл прамовіў наймілей як умеў, — а нам пяць штук марожанага „Марыля".

— Вось гэта ў мяне файная моладзь, — пахваліў нашых сяброў прадавец.

І доўга прамаўляў у адрас паганых трэцякласнікаў. Хоць яго папрокі не датычылі нашых сяброў, усе ў кампаніі пачырванелі.

*(працяг будзе)*

**АРАБІНКА**

# Польска-беларуская крыжаванка № 28




Запоўніце клеткі беларускімі словамі. Адказы (з наклееным кантрольным талонам) на працягу трох тыдняў дашліце ў „Зорку". Тут разыграем цікавыя ўзнагароды.

Адказ на крыжаванку н-р 24: Ікра, рот, род, асалода, матылёк, нарыс, кон, ноты, сыр, вока. Гром, анёл, тата, ар, сыры, малы, лёс, крок, кок, род, нота, адароны.

Узнагароды, аўтаручкі, выйгралі: **Дыяна Капытка**, **Эвеліна Ігнацюк**, **Наталля Янцэвіч**, **Іаанна Якімюк** з Чыжоў, **Гжэгаж Сцепанюк** з Новага Корніна. Віншуем!

*— Мы ж беларускі народ і нашы дзеці павінны ўмець гаварыць па-свойму, — заяўляюць Іаанна Якубюк і Галена Беразавец. — Прыводзім мы ў школу чатырохгадовых або нават трохгадовых дзетак, каб мелі магчымасць развівацца пад наглядам настаўніц.*

# Развіталіся на канікулы ў Ласінцы

**Заканчэнне навучальнага года ў Філіяльнай школе ў Ласінцы праходзіла вельмі ўрачыста. Разам з дзеткамі на мерапрыемства прыбылі бацькі, каб паглядзець слоўна-музычны мантаж, падрыхтаваны на польскай і беларускай мовах. Усе дзеткі, пачынаючы з другога класа, ходзяць на заняткі беларускай мовы, а настаўніца роднай мовы Валянціна Базылюк заяўляе, што за чатырнаццаць гадоў яе педагагічнай працы ў Ласінцы яшчэ не здарылася, каб нейкі вучань не вучыўся гаварыць і пісаць па-беларуску.**

— Калі я вучылася ў Падставовай школе ў Ласінцы, таксама было стопрацэнтнае навучанне беларускай мовы. Ніхто і не думаў, што можа быць інакш. Цяпер бацькі таксама лічаць натуральным, што ўсе дзеці павінны хадзіць на заняткі беларускай мовы, — гаворыць настаўніца Люцына Рушук, якая вядзе заняткі ў нулявым і першым класах.

Калі я пытаю другакласнікаў і трэцякласнікаў: „Хто ўмее гаварыць па-свойму?", амаль усе вучні падымаюць рукі ўверх. Пасля высвятляецца, што частка вучняў мае ахвоту размаўляць на дыялектнай мове, але яшчэ слаба яе ведае. Тыя дзеткі, што дома гавораць з бацькамі па-свойму, лепш таксама ведаюць літаратурную беларускую мову, на якой адказваюць на мае пытанні.

— Мы ходзім на заняткі беларускай мовы, бо гэта наша родная мова, — заяўляе Уля Беразавец, якая на заканчэнне школьнага года атрымала ўзнагароду за вельмі добрыя поспехі ў вучобе і ўзорныя паводзіны. Ужо ў трэцім класе падставовай школы ведае яна, што хоча вучыцца ў беларускім ліцэі.

— Трэба ўмець гаварыць па-беларуску, — падтрымлівае сваю сяброўку таксама выдатнік Кароль Лукша, якога настаўніца хваліць за ўсебаковыя здольнасці.

— На занятках беларускай мовы я ніколі не гавару да дзетак па-польску і яны разумеюць беларускую літаратурную мову. Калі вучні не ведаюць нейкіх паасобных слоў, тады я тлумачу іх значэнне, — кажа настаўніца Валянціна Базылюк.

Развітанне са школай на час канікулаў распачалося з выступлення дашкольнікаў ва ўзросце ад трох да шасці гадоў. Калі ў школе крыху паменшала колькасць вучняў, настаўніцы рашыліся прымаць на заняткі нават вельмі малых дзетак, каб звыкліся са школай. Дашкольнікі спявалі песні і дэкламавалі вершыкі, спазіраючы на сваіх мамаў, якія ў гарачы дзень сенакосаў знайшлі час прыйсці на развітанне з вучобай. Старэйшыя дзеткі таксама падрыхтавалі вершы і песні. Перад уручэннем пасведчанняў і дыпломаў вучні разбегліся па школьных залах і вярнуліся з кветкамі ды ласункамі, якія прынеслі сваім настаўніцам. У невялікай школе педагогі моцна зжыліся з вучнямі і таму ў час развітання з выпускнікамі (трэцякласнікамі), якія пойдуць вучыцца ў Комплекс школ у Нарве, паявілася многа цёплых слоў і слёзы ў вачах. Пасля ўрачыстасці бацькі сталі расказваць пра вучобу ў ласінскай школе, якая зараз размяшчаецца ў будынку былога асяродка здароўя.

Фота АЛЯКСЕЯ МАРОЗА

*Наймалодшыя дзеткі прынеслі многа кветак*

— Нашы настаўніцы вельмі файныя і дзеці ў невялікай школе адчуваюць сябе бяспечна. У вялікай школе ў Нарве (Філіяльная школа ў Ласінцы ўваходзіць у склад Комплексу школ у Нарве — А. М.) маглі б разгубіцца. З настаўніцамі мы можам гаварыць па-свойму. Зараз мы як адна сям'я, — заяўляе Аліцыя Галёнка.

Фота АЛЯКСЕЯ МАРОЗА

*Настаўніцы Валянціна Базылюк (справа) і Люцына Рушук сказалі многа цёплых слоў наконт сваіх вучняў*

Бажэна Галёнка прывяла ў школу чатырохгадовае дзіця, бо хоча каб яно пазнаёмілася з гульнямі старэйшых дзетак. Іншыя мамы таксама сталі прыводзіць у школу малечаў. Калі пытаю бацькоў, ці вучаць яны гаварыць сваіх дзетак на дыялектнай мове, ахвотна адказваюць.

— У мяне двух хлопцаў размаўляе па-свойму, а трэці стаў ужо гаварыць па-польску, — паясняе Аліцыя Галёнка.

— Беларуская мова гэта наша мова, але цяпер штораз больш бацькоў пачынае адразу вучыць сваіх дзяцей гаварыць па-польску, — кажа Ірэна Мінько.

Настаўніцы пацвярджаюць, што з бацькамі і дзеткамі яны часткова гавораць на дыялектнай мове, а заняткі Божага закону таксама часткова вядуцца на мясцовай гаворцы. На ўрокі з праваслаўным святаром ходзяць таксама двое каталіцкіх дзетак.

— Мы ж беларускі народ і нашы дзеці павінны ўмець гаварыць па-свойму, — заяўляюць Іаанна Якубюк і Галена Беразавец. — Прыводзім мы ў школу чатырохгадовых або нават трохгадовых дзетак, каб мелі магчымасць развівацца пад наглядам настаўніц. Калі мы працуем у полі, ёсць каму заняцца нашымі дзяцьмі. Мы хацелі б, каб як найдаўжэй існавала школа ў Ласінцы і нашы дочкі і сыны маглі вучыцца на месцы. Ёсць яшчэ крыху дзяцей і маем надзею, што будуць яшчэ нараджацца.

Вучні з Ласінкі прымаюць удзел у дэкламатарскім конкурсе „Роднае слова", а ў 2004 годзе Дзіма Дзімідзюк атрымаў узнагароду Гран-пры.

— Мы многа ходзім і ездзім на экскурсіі ды супрацоўнічаем са школай у Нарве. У гэтым школьным годзе былі мы ў Белавежы, Лазіцах, Надлясніцтве Броўск і Беластоку. На занятках беларускай мовы я стараюся навучыць дзетак правільна чытаць і пісаць, — кажа настаўніца Валянціна Базылюк.

Зараз у ласінскай школе, апрача мясцовых дзетак, вучацца вучні з Кавылы, Навінаў і Катлоўкі. Філіяльная школа ў Ласінцы была створана пасля адукацыйнай рэформы і стварэння гімназічных школ. Спачатку вучыліся тут таксама дзеткі з Кутавой і Рэпіск, а пасля яны пачалі хадзіць на заняткі ў Нарву. Апошнім часам у Гміннай радзе ў Нарве ўзнікла дыскусія наконт коштаў утрымання невялікай школы ў Ласінцы. Справа лічэння коштаў і магчымай ліквідацыі школы прыціхла перад набліжаючыміся самаўрадавымі выбарамі і таму жыхары Ласінкі могуць прыслухвацца дэкларацыям кандыдатаў на войта і гмінных радных наконт існавання філіяльнай школы, у якую ў гэтым годзе хадзіла 22 дзетак (прадбачваецца, што ў наступным школьным годзе прыйдзе 25 школьнікаў, разам з наймалодшымі).

— Кошты ўтрымання нашай школы ў пераліку на адно дзіця, што мае абавязак хадзіць у нулявы клас або школу, у нас вышэйшыя, чым у Комплексе школ у Нарве. Аднак калі таксама палічыць маленькіх дзетак (ніжэй шасцігадовага ўзросту, за якіх няма кампенсацыі з дзяржаўнага бюджэту), тады кошты ўтрымання нашай школы ніжэйшыя за нарваўскую. Малой школе лягчэй атрымаць большую фінансавую дапамогу ў пераліку на аднаго вучня. Да каго не звернемся, нам дапамагаюць. Нашымі найбольшымі спонсарамі з'яўляюцца Нарваўскі дом культуры, Публічная бібліятэка ў Нарве і айцец Аляксей Кулік, які са сваіх прыватных сродкаў дафінансаваў падарункі на ёлку для ўсіх вучняў (па 20 злотых на кожную асобу). Аднак найбольшая дапамога ад бацькоў, без якіх не змаглі б мы рады ладзіць большых мерапрыемстваў, — гаворыць настаўніца Люцына Рушук. — Ёлка з'яўляецца ў нас найбольшым сямейным мерапрыемствам. Прымаюць удзел у ёй — апрача вучняў і бацькоў — гмінныя ўлады.

Пасля школьных урачыстасцей настаўніцы праводзяць мяне па школе і па чарзе паказваюць класныя кабінеты. Школа займае ўвесь другі паверх і частку першага, на якім выдзелена месца для лекара, які прыязджае да жыхароў Ласінкі і навакольных мясцовасцей з Нарвы. Хаця дзеткі вучацца ў дзвюх спалучаных групах, карыстаюцца 4 класнымі заламі. Для хлопцаў і дзяўчат выдзелены туалеты, а знізу знаходзіцца прасторная раздзявальня. Асобны кабінет выдзелены для навучання беларускай мовы. Праз увесь школьны год знаходзяцца ў ім беларускамоўныя насценгазеты і пастаянная экспазіцыя льняных вырабаў, глінянага посуду і даўніх прыладаў працы. Экспанаты прыносілі вучні і бацькі ды аставілі на патрэбы школы.

— Мы выходзім у мясцовае асяроддзе. У нашай школе ладзяцца вясковыя сходы. Гасцявалі ў нас работнікі Сельскагаспадарчага дарадчага асяродка з Гайнаўкі і Агенцтва мадэрнізацыі і рэструктурызацыі сельскай гаспадаркі, — інфармуе пры канцы размовы спадарыня Люцына Рушук.

**Аляксей МАРОЗ**

# Літаратары на „белавежскіх” гонях

**— Пражылі мы тут, у Літаратурным беларускім аб’яднанні, амаль паўстагоддзя, — сказала на чарговым семінары „Белавежы” Алена Анішэўская з Варшавы, ураджэнка Белавежы, адна са старэйшых дзейсных яе членаў, — вельмі сэнсоўна, і пакінем у гісторыі нашага рэгіёна трывалы след, не так кожны паасобку, але ўсе разам. Кожны з нас насіў у сабе „pierwiastek”, корань нашае нацыі. Некаторыя з нас, як я, не хадзілі ў беларускія школы. Кожны з нас вынес са свае сям’і штосьці такое, што нас звязвала з нашай беларускасцю. Камусьці натура ці Бог падарылі трохі таленту і магчымасці развіваць той талент. Магу сказаць крыху пра сябе. Мой бацька быў беларускі дзеяч. У вайну мне было 14 гадоў, як майго бацькі не стала. Што я вынесла з таго часу, калі я жыла з бацькамі-беларусамі?**

Фота МІРЫ ЛУКШЫ

*Маладыя і „старыя” „белавежцы”*

Прыходзілі да бацькі якіясь людзі. Прыходзіў у Белавежу чалавек са Свіслачы. Калісьці кажа мне: „Ленка, хадзі, я навучу цябе беларускага верша”. Я яго запамятала да гэтай пары, хоць не цэлы. „Гэта верш пра беларуса, каб ты не забыла”. *Нос аблезлы, загарэлы, на калені порткі злезлі, жонка шчуплая кабета, меў кабылку — здохла ўлетку*... Я вучылася, працавала. Заехала ў Белавеж на наш Новы год. Святкавалі Шчадруху. Я вярнулася да таго, што я запамятала са свайго дзяцінства. Што спявалася, — беларускія песні, тое, што прывезлі з бежанства, крыху польскіх песень, што ў войску пачулі. Калі я заехала ўжо ў 1946 годзе на Шчадруху, мне сказалі дзяўчаты і мама, што ўжо не тое, што штось ад нас адыходзіць. І мне стала шкада таго, што мінае. Я тады напісала апавяданне „Шчадруха”. Гэта мяне кранула да таго, каб увекавечыць тое, што я памятаю, што я захавала беларускае. Каб не загінула. Я ж іншымі справамі займалася. Я не маю прэтэнзіі, каб мяне называлі літаратарам. Калі б не наша арганізацыя, калі б не „Ніва”, не было б цяпер у нас нічога беларускага, можа, толькі дзе-нідзе ў каго штосьці захавалася б. Я нарадзіла ў Варшаве дачку, ёй таксама ўжо неўзабаве 50 гадоў будзе, і яна ў Варшаве гаворыць па-нашаму. Існаванне „Белавежы” як арганізацыі памагала нам захавацца, існаваць далей, і для гісторыкаў будзе важна, што на Беласточчыне да XXI стагоддзя жылі беларусы. Але колькі ў гэтым руху аб’явілася творцаў! Плённых і патрыятычных, як Віктар Швед, такіх, што свет аб’ехалі і ўсё па-беларуску апісалі, як Дзіма Шатыловіч, якія дакументальна расказалі пра наш лёс, як Васіль Петручук... На трыццацігоддзе „Белавежы” я склала невялікую паэму „Наш Парнас”, у якой апісала жартаўліва нашых творцаў. Цяпер наша арганізацыя вельмі сарганізаваная, трымае нас у жмені наш старшыня. Толькі нас малавата... Вельмі цешуся, што бачу маладых.

— З 1958 года выдадзена намі шмат кніжак, пра гэтыя кніжкі пішуць, і чытаюць іх, — старшыня літаб’яднання прафесар, паэт Ян Чыквін, якога яно прыгарнула было ў свае рады, калі быў вучнем Бельскага беларускага ліцэя лічыць, што наш „літаратурны саюз” з таго часу і да сёння гуртуе творцаў, якія і самі па сабе маглі б існаваць, але ў гурце найдаўжэй дзейнічаючай не толькі ў Польшчы літаратурнай групы свая моц. — Цяжка сабраць творчых асоб. Неўзабаве круглая дата — паўвечча. Мы павінны ганарыцца тым, што зроблена за гэты час. На адно можна пажаліцца — што паміж старэйшым пакаленнем пачынальнікаў і заснавальнікаў „Белавежы” і малодшым пакаленнем — вялікі разрыў. Няма арганічнага пераходу з пакалення ў пакаленне. Але гэта не фабрыка, дзе выпускаюцца, скажам, машыны серыя за серыяй. Мабыць, наша беластоцкая зямля мела нейкі патэнцыял, які ўспыхнуў тады, гэта ўсё ўключылася ў творчы працэс, некаторыя гуртуюцца ў іншых арганізацыях, напрыклад, у „Бязмежжы”, іншыя хочуць існаваць самастойна пасля таго, як заіснавалі праз „Белавежу”, быццам яна ім ужо непатрэбная. І так, і не, залежыць у чым. Калі гаварыць пра справы нацыянальныя, агульналітаратурны працэс, то кожная арганізацыя патрэбная. Праз арганізацыю некаторыя справы для літаратуры лягчэй аформіць. Публікацыі, заіснаванне. Каб гэта было не так, не было б на свеце ніякага саюза пісьменнікаў, творчых прафесійных саюзаў. Калі чалавек мае штосьці напісаць, трэба сесці над лістом паперы; тады ніякая арганізацыя непатрэбная...

— Нашы бацькі і мы выхаваліся на вашых творах, — заўважыў малады „белавежац” Юрка Буйнюк, аўтар першае свае кнігі ў Бібліятэцы „Белавежы”. — Я з вялікім сентыментам успамінаю сваю першую бібліятэку ў Малінніках, дзе было шмат кніжак „белавежцаў”. Мы ўсе выводзімся з правінцыі — з падгайнаўскіх, падбельскіх вёсак. Кожны з нас мае свой куточак, які яго інспіруе, у які вяртаецца. Нас не цікавіць ніякая палітычная ідэалогія. Мы змучаны гэтай гонкай за палітыкай, за гэтым змаганнем. Мы, маладое пакаленне, хочам заняцца мастацтвам. Той недахоп ідэалогіі заўважаем у „белавежцаў”, і гэта нас інспіруе да творчасці. Вельмі цудоўна было нам пазнаёміцца з такімі вялікімі аўтарытэтамі беларускай літаратуры не толькі на Падляшшы, але і ў свеце. Для нас вельмі важная падтрымка. Я хацеў бы, каб свае зборнічкі выдалі Юстына, Марта і Аліна. Вялікім полем для заіснавання з’яўляецца таксама і Інтэрнэт. Мы не з’яўляемся мясам, якое мае ісці на барыкады. Мы хочам біцца словам. Захаваць беларускую мову. Друкавацца. Прыдаўся б нам нейкі часопіс, нейкая старонка, як калісь была ў „Ніве”...

**Міра ЛУКША**

# Бой пад Пілавай

**Расказвае 83-гадовы Аляксей ЗЯЛІНКА, жыхар Сухавольцаў Кляшчэлеўскай гміны.**

— На работы ў Нямеччыну прызывалі хлопцаў і дзяўчат паводле года нараджэння. Сямейных не бралі. Кандыдатаў вызначаў солтыс. Павестку прыслалі ў 1941 годзе. Пахадайнічаў я за адтэрмінаванне, паколькі маіх равеснікаў бралі пазней. Адтэрмінавалі на два тыдні. Афармілся я на работу ў насычальні. Яшчэ тройчы карыстаўся адтэрмінаваннем. Знаёмы жандар афармляў справу. Ажаніўся я ў дзевятнаццаць год, каб пазбегчы вывазкі. Маёй шлюбнай было ўсяго шаснаццаць. Здзелка аказалася непрыдатнай. Забралі мяне ў 1942 годзе, проста з работы, калі трымаў варту на пуці. Завезлі на зборны пункт у Бельску-Падляшскім, затым адправілі ў Кёнігсберг. Памесцілі нас у адной зале, дзе нямецкія ўдавіцы выбіралі сабе работнікаў на гаспадарку. Мяне спадабала старэйшая немка, заплаціла сем марак. Калі яна афармляла дакументы, падышоў да мяне паляк, які прапанаваў работу на судне. Сябе назваў ён брыгадзірам. Не сказаў, якая будзе гэта работа. Згадзіўся я на ягоную прапанову. У Кёнігсбергу на судне пры пагрузцы і выгрузцы тавараў працаваў я два гады. Набліжаўся фронт. У горадзе праходзілі крывавыя змаганні за кожны дом, за кожную вуліцу. Немцы пацярпелі паражэнне. Я разам з іншымі работнікамі апынуўся сярод нямецкіх палонных. Рускія дзялілі нас па нацыях, палякаў ды іншаземцаў адпускалі дамоў. Паводле дакументаў я лічыўся беларусам. Адправілі мяне на фронт. Апынуўся я пад Пілавай (па-нямецку: Pilau, цяпер: Балтыйск Калінінградскай вобласці). Двое сутак знаходзіўся я ў акопах, у вадзе. Не было загаду наступаць. Пасля загадалі: „Заваяваць горад!” У гэтым баі я атрымаў раненне ў пазваночнік. На полі бою знайшлі мяне рускія сабакі. Апынуўся я ў палявым шпіталі. Зрабілі аперацыю. Вынялі асколкі. Затым адправілі ў Інстэрбург. Там дачакаўся канца вайны. Пасля ўключылі ў рады Савецкай Арміі. Хоць іншаземцаў адпускалі, мяне затрымалі. Назначылі мяне ў службу забеспячэння, якая абеспячала салдат харчовымі прадуктамі. Няспынна хадайнічаў я за тым, каб вярнуцца дамоў. На пытанне калі мяне адпусцяць, заўсёды гаварылі: „Поедешь”. Не называлі аднак тэрміну. Паколькі я праходзіў рэабілітацыю пасля аперацыі, дык увесь год яшчэ заставаўся ў арміі. У наступным адпусцілі. Дамоў вярнуўся я ў 1946 годзе перад Грамніцамі. Заняўся гаспадаркай. Прыехалі аднойчы партыйныя агітатары і хацелі ў вёсцы арганізаваць калгас. Сілком казалі заносіць заявы. Людзі адмовіліся. Агітатары ад’ехалі ні з чым. У Сухавольцах калгас не сарганізавалі.

Фота УЛАДЗІМІРА СІДАРУКА

*Марыя і Аляксей Зялінкі*

**Уладзімір СІДАРУК**

# http://zhodzina.com

Лета — час вандровак і адпачынку ад палітычных баталій. Праўда, калі зважаць на Беларусь, то цалкам адарвацца ад палітыкі там немагчыма, бо пралазіць яна праз усе шчыліны, пранікае ў кожны дом, уліваецца амаль у кожную большменш сур'ёзную размову. Вось і сённяшняя наша вандроўка будзе мець не толькі азнаямляльны характар аб адным з цікавых і старадаўніх беларускіх гарадоў — Жодзіне, але і палітычна-асветніцкі. Сайт сваёй назвай „Незалежная рэспубліка Жодзіна" прадвызначае змест інфармацыі аб горадзе, дзе вырабляюць цяпер сусветнавядомыя „БелАЗы".

Каб выйсці на сайт, які сваёй афарбоўкай нагадвае бел-чырвона-белы сцяг, трэба набраць на камп'ютэры адрас http://zhodzina.com. У вочы адразу кідаецца назва, якая месціцца на фоне негатыва фотаздымка і герба Жодзіна.

Тое, што адразу прыцягвае да сябе ўвагу пасля, зразумела, назвы — гэта выйсце на рубрыку „Чорны спіс Жодзіна", дзе стваральнікі сайта сабралі звесткі аб тых апантаных прыхільніках лукашэнкаўскага рэжыму, якія, на іх думку, груба парушалі правы чалавека. Да кожнага прозвішча дадаецца тое, у чым вінавацяць незалежныя жодзінцы гэтых асоб. Праўда, у адрозненні ад іншых старонак сайта, гэтая выкананая на рускай мове.

З левага боку на галоўнай старонцы, як звычайна, месцяцца выйсці да іншых старонак. Сярэдзіна адданая на абвесткі і найбольш важныя навіны. Ну а трэцяя, правая частка сайта мае выключна мясцова-жодзінскі характар, бо там прапануецца прагаласаваць па розных пытаннях тамтэйшага жыцця.

У рубрыцы „Навіны" для чытачоў „Нівы", здаецца, найбольш цікавым будзе паведамленне аб тым, як жодзінскія ўлады не далі мясцоваму музычнаму гурту правесці адборачны тур дзеля атрымання магчымасці трапіць на „Басовішча-2006".

Рубрыка „Гісторыя" распавядае аб тым, як узнікла Жодзіна, падае розныя версіі паходжання назвы, а таксама гістарычную храналогію горада. Незалежныя жодзінцы абгрунтавана лічаць, што заснавальнікам іхняга горада былі ўласнікі тых зямель — род Радзівілаў, а менавіта Багуслаў Радзівіл. Само ж Жодзіна ўпершыню згадваецца ў 1688 годзе як „Жодзіна слабада".

Аб сучасным Жодзіне добра распавядаецца на старонцы „Культура". Там месцяцца матэрыялы мясцовага пісьменніка Уладзіміра Сіўчыкава і Святланы Станкевіч, якая трапіла ў мясцовы пастарунак за ўдзел у вядомых акцыях у Мінску напрыканцы сакавіка гэтага года. Яе ўспаміны, а таксама старонка „Героі Жодзіна" вельмі добра паказваюць, як ахвяруе сабой мясцовая моладзь дзеля дэмакратыі і незалежнасці Беларусі. Бо ў адрозненні ад незразумелай і блытанай лукашэнкаўскай ідэалогіі, іх ідэі носяць зразумелы і прымальны для кожнага беларускага патрыёта змест. Прыкладам можа быць абгрунтаванне акцыі „Горад — наш": «Акцыя „Горад — наш!" мае за мэту данясенне пазытыўнага бачаньня будучыні Беларусі. Напярэдадні беларускіх нацыянальных сьвятаў на дахах дамоў гораду Жодзіна вывешваюцца бел-чырвона-белыя нацыянальныя сьцягі, як сымбаль свабоды і незалежнасьці нашае краіны».

Магчыма, сайт яшчэ не да канца распрацаваны. Аб гэтым сведчаць пытанні ў „Гасцёўні" пра ягоную канцэпцыю. Але ў сайта з трохі дзіўнай назвай насамрэч ёсць усе шанцы, каб стаць крыніцай альтэрнатыўнай інфармацыі для мясцовага люду.

**Уладзімір ЛАПЦЭВІЧ**

# Беларусь, беларусы...

**У рэжыме нон-стоп**

У той час, калі жарсці на чэмпіянаце свету ў Нямеччыне дасягнулі апагею, беларускі футбол ідзе сваёй нетаропкай хадой. Напэўна разумней было б узяць паўзу ў чэмпіянаце краіны, а беларускім трэнерам і гульцам уважліва вывучаць практыку лепшых дружын планеты на мундыалі. Але чэмпіянат Беларусі перапынку не зрабіў. Днямі завершыцца першы круг турнірнай дыстанцыі.

Нечакана на першай пазіцыі ідзе ждановіцкая „Дарыда", якую перад сезонам ніхто не разглядаў як прэтэндэнта на медалі. Людасу Румбуцісу ўдалося стварыць баяздольны і збалансаваны калектыў, з якім цяпер абавязаны лічыцца асноўныя фаварыты. На другім месцы пакуль барысаўскі БАТЭ — дзецішча энергічнага прадпрымальніка Анатоля Капскага. Характэрна, што пасля адыходу ў іншы клуб трэнера Юрыя Пунтуса, каманда не здае высокіх пазіцый. Ігар Крывушэнка, які заступіў на пост рулявога — гэта трэнер новай фармацыі і сучаснага еўрапейскага мыслення. Дастаткова сказаць, што ён добра валодае англійскай мовай, што не характэрна айчынным спецыялістам. У бягучым сезоне БАТЭ ўжо заваяваў Кубак краіны (у прыгожым стылі барысаўцы адолелі салігорскі „Шахцёр") і па ўсім відаць, што ён не супраць падмацаваць гэты поспех золатам першынства Беларусі. Дзейсны чэмпіён „Шахцёр" нечакана для многіх гуляе пакуль з натугай. Куды большага на старце чакалі прыхільнікі „Гомеля" і сталічнага МТЗ РІПА. Гэтыя клубы найлепей укамплектаваныя, але пакуль не апраўдваюць авансаў. Падцягнулася да групы лідэраў мінскае „Дынама", якое перацярпела чарговую змену трэнера. Па ўсёй імавернасці названая шасцёрка клубаў разыграе медалі і пуцёўкі ў еўракубкі наступнага года.

А сёлетні розыгрыш кантынентальных кубкавых турніраў ужо стартаваў. У найменш прэстыжным Кубку Інтэртота Беларусь прадстаўляюць сталічныя „мазаўцы". У першым крузе МТЗ пакінуў за бортам спабору казахстанскі „Шахцёр" з Караганды. У першым матчы на полі суперніка беларусы не пакінулі ім аніякіх шанцаў — 5:1. Якое ж было здзіўленне, калі дома падначаленыя Юрыя Пунтуса бязвольна саступілі 1:3, заставіўшы нават пахвалявацца сваіх прыхільнікаў за зыход двухраундавай дуэлі. У наступнай стадыі апанентам беларусаў стаў клуб „Масква" з Расіі. За гэтую каманду выступае галкіпер зборнай Беларусі Юрый Жаўноў. У першым паядынку ён адбіў усе наскокі суайчыннікаў і „Масква" перамагла — 2:0. Прычым другі гол беларусы, якія не рэалізавалі свае шанцы, прапусцілі за пару хвілін да фінальнага свістка. Аб'ектыўна, надзей на тое, што дома МТЗ адыграецца, няшмат. Надта ж ужо няўдала гуляюць з усходнімі суседзямі ў еўракубках беларускія каманды.

Жараб'ёўка вызначыла суперніка іншых беларускіх клубаў. У першым кваліфікацыйным раундзе Лігі чэмпіёнаў салігорскі „Шахцёр" сустрэнецца з „Шырокім Брэгам" — мацнейшай камандай Босніі і Герцагавіны. Цікава, што пераможца далей трапіць на шатландскі „Хартс", які днямі ўзначаліў добра вядомы беларусам Эдуард Малафееў. У Кубку УЕФА сталічнае „Дынама" паспрачаецца з польскім „Заглэмбе" з Любліна. А БАТЭ трэба пераадольваць бар'ер малдоўскага клуба „Ністру" з горада Атакі. Два гады таму з гэтым клубам змагаўся „Шахцёр" і саступіў. Чамусьці здаецца, што БАТЭ выступіць больш удала. Кожнае ачко ўплывае на рэйтынг краіны. У Беларусі ён пакуль невысокі (39-ы з 52-х).

**Уладзімір ХІЛЬМАНОВІЧ**

# *Таямніцы і чары*

Добра памятаю жнівеньскія дні мінулага года, калі мы ў складзе дэлегацыі з пятнаццаці чалавек прыехалі ў Гайнаўку, каб прыняць удзел у праекце „Забытых таямніцаў чар".

Гасцінна сустрэла нас польская зямля. Утульная атмасфера спрыяла рабоце, якая не дазваляла расслабіцца. Працавалі цэлымі днямі з малымі перапынкамі на каву-гарбату і абед. Даклады прафесараў універсітэтаў з Варшавы, Беластока, Брэста, практычныя заняткі, экскурсіі і дыспуты, абмен думкамі з настаўнікамі Гайнаўшчыны, прагляд слайдаў, фільмаў і г.д.

Перад ад'ездам кожны атрымаў заданне і падрабязны план далейшых дзеянняў на ніве збірання матэрыялаў для будучай кнігі. Не вельмі верылася, што кніга атрымаецца. Здавалася, усё так і застанецца ў мроях і на паперы ў якасці нязбыўных пажаданняў.

Ішоў час. Паступова здзяйсняліся задумкі каардынатара праекта Наталлі Герасімюк, якая ні на крок не адступіла ад сваіх планаў. У 30-градусны мароз польскія дзеці збіралі матэрыял, пераязджаючы з вёскі ў вёску на тэрыторыі Камянецкага раёна, а нашы вучні выконвалі такую ж місію на Гайнаўскай зямлі.

Наперадзе было, бадай, самае цяжкае: з вялікай колькасці сабраных матэрыялаў выбраць тое, што з'яўляецца легендай, паданнем ці аповесцю, адкінуўшы лішняе, непатрэбнае.

Вось тут для спадарыні Наталлі пачаліся бяссонныя ночы перад камп'ютэрам. Не адзін дзесятак разоў перачытаныя тэксты нарэшце паўсталі ў „прычасаным" выглядзе. Яны цікавыя, інтрыгуючыя і з густам афармленыя. Кожны, хто трымаў у руках кнігу, адразу пачынаў знаёміцца са зместам, каб пачаць чытанне з апісання сваёй мясцовасці, а потым — усё запар.

Адарвацца ад зборніка цяжка, бо напісаны ён даступнай мовай, зразумелай і дзецям, і дарослым. Кніга будзе запатрабаванай у першую чаргу настаўнікамі для азнаямлення дзяцей з далёкай мінуўшчынай свайго краю; зацікавяцца ёю, несумненна, школьнікі і, канешне ж, жыхары навакольных вёсак, якія былі задзейнічаны ў рабоце. Менавіта ад іх пачулі многа цікавага і карыснага ўсе ўдзельнікі праекта.

Нізкі паклон і ўдзячнасць сп. Наталлі Герасімюк за такі цікавы праект і за кнігу, якая стане настольнай для кожнага з нас.

Па даручэнні ўдзельнікаў праекта з беларускага боку

**Тамара КУЧКО**
**дырэктар Высокаўскага дома культуры**

Post Scriptum:

*Ганаруся, што я ўдзельнічала ў праекце і пазнаёмілася з цудоўнымі людзьмі, што жывуць на Гайнаўскай зямлі і займаюцца карыснай і цікавай справай.*

*М. І. Новік*

*Было прыемна працаваць над ажыццяўленнем праекта, адчуваючы вялікую патрэбу ў падобных мерапрыемствах, якія яднаюць апантаных слушнай ідэяй людзей.*

*С. А. Варонік*

*Віншую Наталлю Герасімюк з выхадам цудоўнай кнігі. Ведаю, што 90% работы зрабіла яна: сам праект, выверанны да дробязей; добра падабраная каманда выкладчыкаў — лектараў; карысныя падарожжы; заняткі — семінары ў музеі. Абмен групамі школьнікаў — агромністая адказнасць за кожны іх крок і сказанае слова. Апрацоўка сабранага матэрыялу патрабавала таксама максімуму адказнасці, таленту і дакладнасці. І, нарэшце, афармленне кнігі гаворыць аб тым, што ў спадарыні Наталлі бездакорны густ. Жадаю далейшых поспехаў у творчасці. А Музею беларускай культуры трэба ганарыцца такімі таленавітымі і бескарыслівымі супрацоўнікамі.*

*Ю. І. Сахарчук*

*Вельмі рада за Наталлю. Зычу ёй здароўя і новых поспехаў на ніве прапаганды роднага беларускага слова.*

*З. М. Калеснік*

*Ганаруся дачушкай і вельмі ёй спачуваю. (А тыя памылкі, што дзе-нідзе сустракаюцца ў кнізе, прашу лічыць апячаткамі).*

*Т. С. Лаўранчук*

# Як жылося Орлі без войта

Тры месяцы арлянская самаўправа заставалася без свайго „бацькі”, а гміна без гаспадара. Былы войт Міхал Іванчук прыняў пасаду 15 верасня 2003 года ў выніку нечарговых выбараў пасля заўчаснай смерці ранейшага войта Яна Добаша. Перапынак у гаспадаранні Міхала Іванчука не быў доўгі, таму што ён быў войтам у 1989-1999 гадах. Дзякуючы тадышнім дасягненням яго назвалі будаўніком дарог і водаправодаў, хаця і тады ён бываў героем публічнай актыўнасці пад хмяльком. 23 снежня 1999 года ён быў адхілены ад пасады тадышняй Гміннай радай з прычыны „адсутнасці супрацоўніцтва з Радай”. Але выбаршчыкі добра помнілі інвестыцыі, якія ён раней праводзіў і паўторна далі шанс стаць гаспадаром гміны. На ўрачыстай сесіі, прымаючы зноў пасаду, Міхал Іванчук заяўляў, што „будзе сумленна выконваць істотныя з грамадскага пункту гледжання задачы”. Аднак новы-стары войт не ўсім у Гміннай радзе пасаваў і пасля некалькіх месяцаў бельская паліцыя затрымала яго ў Орлі, у ягоным „Малюху”, пад хмяльком. Ягоная справа доўга бадзялася па розных судах, лістах да ваяводы, аж 7 красавіка г.г. Міхал Іванчук, які ў тым часе пачаў пракладку каналізацыі ў Орлі, страціў пасаду (хаця працаўнікі ўправы гаварылі, што быў ён яшчэ прысутны і 13 красавіка).

Фота МІХАЛА МІНЦЭВІЧА

*Зароку, дадзенага 15 верасня 2003 года на ўрачыстай сесіі арлянскай Гміннай рады (на здымку), войт Міхал Іванчук не стрымаў*

Як жыхар Орлі магу сказаць, што адсутнасць гміннага гаспадара амаль была незаўважная. На тэрыторыі гміны як і ў самой управе пануе выцішэнне і спакой, хаця той спакой толькі ўяўны, бо з-за спынення многіх вырашальных працэдур трацяць усе жыхары гміны, а асабліва некаторыя з іх.

— У чым праблемы, калі не было войта? — пытаю сакратара гміны Ірэну Адзіевіч.

— У многіх справах. Хацелі мы падаць заяву на дафінансаванне ў рамках аховы вёскі, але тэрмін мінуў 5 мая. Праект кранаў добраўпарадкавання цэнтра Орлі: парку, пляцоўкі для гульняў, рамонту лавак і закладкі асвятлення ў парку ды ўзбуйнення аўтастаянкі каля Гміннай управы.

Чарговы клопат, бо можам страціць дафінансаванне да завершанага першага этапу (чатыры вуліцы) каналізацыі ў Орлі, а гэта будзе каштаваць больш за 511 тысяч злотаў.

Далей, не можам пачаць пракладкі водаправода ад водазабору ў Орлі да Крывятыч (там жыхары карыстаюцца вадой неадпаведнай якасці з водазабору на тэрыторыі вясковай свінафермы — М. М.).

Не падпісаны дамовы пра публічныя інтэрвенцыйныя і грамадска карысныя працы.

Кадравыя праблемы: чатыром маладым працаўнікам мінулі тэрміны працоўнай дамовы і яны зарэгістраваліся ў Павятовай управе працы ў Бельску. Аб’яўлены конкурс на пасады гмінных чыноўнікаў, але былы войт не апрацаваў нават рэгламенту.

У бельскім Судзе працы незавершаны дзве справы, бо няма каму прадстаўляць гаспадара гміны.

У Гміннай управе двух працаўнікоў, з якімі войт падпісаў трэцюю працоўную дамову на вызначаны час. І цяпер яны мусяць падаць у суд, каб сцвердзіць, што дамова павінна быць бестэрміновая. І ў гэтай справе няма каму прадстаўляць войта ў судзе.

Стратныя таксама падапечныя Гміннага асяродка сацыяльнай апекі, бо з-за адсутнасці некаторых рашэнняў войта спынены некаторыя датацыі. Гэтыя грошы не прападуць, але пакуль людзі астаюцца без іх.

Складанасці паяўляюцца і ў кантактах з Бельскім староствам. І так павятовыя ўлады спынілі некаторыя рашэнні датычныя Арлянскай гміны да часу завяршэння размоў з гмінным камісарам, м.інш. пра перасяленне чатырох сем’яў з Міклашоў.

У гміне няма, па сутнасці, вольных камунальных кватэр, але па вуліцы Аградовай ад пяці гадоў стаіць новы гмінны блёк з васемнаццацю кватэрамі, у большасці незаселенымі; з-за гэтага гміна нясе страты ў абаграваль ны перыяд. З боку староства была прапанова фінансавай дапамогі да ўнутранай аддзелкі некаторых кватэр для наёму згаданым перасяленцам.

Спынена таксама завяршэнне пракладкі тратуара на павятовай вуліцы Бельскай у Орлі, для якога староства мела даць тратуарныя пліты, якія паклалі б гмінныя работнікі.

* * *

У канцы чэрвеня падляшскі ваявода прызначыў Генрыка Лукашэвіча з Гайнаўкі выконваючым абавязкі войта гміны Орля. Самаўрадавыя выбары ў Польшчы адбудуцца, мабыць, 12 лістапада.

**Міхал МІНЦЭВІЧ**

# У Дубінах

Дзесятае чэрвеня — прыгожы, сонечны дзень. Перад школай у Дубінах многа машын. Школьныя аўтобусы давозяць дзяцей з навакольных вёсак. У школе пануе прыўзняты настрой, радасна гамоняць дзеці. Да мікрафона падыходзяць дырэктар Падставовай школы Ніна Валкавыцкая і дырэктар Гімназіі Тамара Крайнік ды вітаюць усіх прысутных на сямейным фэсце „Знайдзі час для свайго дзіцяці”. У ходзе мерапрыемства адкрыты будзе Цэнтр бяспекі дарожнага руху і адбудзецца прэзентацыя дзеянняў, прымеркаваных да рэалізацыі праграмы „Школа мараў”.

Гмінны цэнтр бяспекі дарожнага руху ўзнік па ініцыятыве войта Гайнаўскай гміны Вольгі Рыгаровіч, якую фінансава падтрымала дырэктар Ваяводскага цэнтра дарожнага руху Альжбета Філіповіч. Дубінскія вучні ад некалькіх гадоў паспяхова ўдзельнічаюць у павятовых турнірах па бяспецы дарожнага руху. Найважнейшыя дасягненні гэта І месца гімназічнай каманды ў 2005 годзе, І месца школьнай і ІІ месца гімназічнай каманд у 2006 годзе. Дырэктар школы Ніна Валкавыцкая мяркуе, што ў будучыні вучні паспяхова выступяць на ваяводскіх і цэнтральных спаборніцтвах.

Фота АНДРЭЯ ЯЛОЗЫ

*Гімназісткі Моніка Алексяйчук і Кацярына Дунда*

Ваяводскі цэнтр дарожнага руху перадаў школе абсталяванне і адукацыйна-дыдактычныя матэрыялы агульнай вартасцю 12 235 зл. Школа атрымала, між іншым, 5 веласіпедаў, велакаскі, святлаадбіваючыя камізэлькі, тэлевізар, відэаплэер, праектар, фільмы, дыяграмы. Ад войта Вольгі Рыгаровіч школы атрымалі мапед і новую мэблю для кабінета камунікацыйнага выхавання агульнай вартасцю 5 600 зл. Спадарыня войт пажадала вучням поспехаў у навуцы і бяспекі на дарозе ды падзякавала ўсім спонсарам фэсту.

Дырэктар Гімназіі Тамара Крайнік у сваю чаргу прадставіла праграму „Школа мараў”, якая сваёй мэтай ставіць, між іншым, мацаванне пачуцця ўласнай вартасці сярод вясковых вучняў. У рамках праграмы будуць весціся пазаўрочныя заняткі па дасканаленню валодання англійскай і нямецкай мовамі, па прадпрымальніцтве, агратурызме, рэгіянальнай кулінарыі, мультымедыйных тэхніках. Праграма прадугледжвае таксама стварэнне Цэнтра тэрапіі і кансультацыі на тэму спецыяльных патрэб вучняў у навуцы, іх бацькоў і настаўнікаў.

Затым пачалася мастацкая частка. Выступілі вучні ІІ класа, якія займаюцца ў школьным тэатры „Гокус-покус” пад кірункам настаўніцы Галены Хадакоўскай. Гімназісты, якіх падрыхтаваў настаўнік Яўген Іванюк, засяродзіліся на пытаннях бяспекі дарожнага руху, а гімназісткі Моніка Алексяйчук і Кацярына Дунда праспявалі, між іншым, песні „Апошняе спатканне”, „Дарма Ясю ходзіш”, „Цячэ вада ў ярок”.

На канец мерапрыемства дырэктар Падставовай школы Ніна Валкавыцкая падзякавала вучням абедзвюх школ і настаўнікам за цікавыя ўрокі па бяспецы дарожнага руху ды запрасіла прысутных на ўрачыстасць адкрыцця Гміннага цэнтра бяспекі дарожнага руху. Стужку перарэзалі войт Вольга Рыгаровіч і кіраўнік Бюро Павятовага агенцтва рэструктурызацыі і мадэрнізацыі сельскай гаспадаркі ў Гайнаўцы Мікалай Яноўскі. Затым настаяцель Дубінскага прыхода а. Васілій Негярэвіч асвяціў цэнтр і пажадаў усім вучням бяспечнай язды.

**Андрэй ЯЛОЗА**

Ніва
ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ
PL ISSN 0546-1960
NR INDEKSU 366714

**Нakład**: 1000 egz.
**Выдавец**: Праграмная рада тыднёвіка „Ніва”.
**Старшыня**: Яўген Вапа.
**Адрас рэдакцыі:** 15-959 Białystok 2, ul. Zamenhofa 27, skr. poczt. 149.
**Тэл./факс:** (+48 85) 743 50 22.
**Internet**: *http://niva.iig.pl/*
**E-mail**: *redakcja@niva.iig.pl*

*Zrealizowano przy udziale wsparcia finansowego Ministra Spraw Wewnętrznych i Administracji.*
**Галоўны рэдактар:** Яўген Вапа.
**Намеснік гал. рэдактара:** Віталь Луба.
**Тэхнічны рэдактар:** Адам Паўлоўскі.
**Рэдактар „Зоркі”:** Ганна Кандрацюк-Свярубская.
**Публіцысты:** Міхась Андрасюк, Мікола Ваўранюк, Аляксандр Вярбіцкі, Ганна Кандрацюк-Свярубская, Міраслава Лукша, Аляксей Мароз, Ада Чачуга, Мацей Халадоўскі, Паўліна Шафран-Асташэвіч.
**Канцылярыя:** Галіна Рамашка.
**Камп’ютэрны набор і карэктура:** Яўгенія Палоцкая.
**Друкарня**: „Orthdruk”, Białystok.
Tekstów nie zamówionych redakcja nie zwraca. Zastrzega sobie również prawo skracania i opracowania redakcyjnego tekstów nie zamówionych. Za treść ogłoszeń redakcja nie ponosi odpowiedzialności.
**Prenumerata:** 1. Termin wpłat na prenumeratę na IV kwartał 2006 r. upływa 5 września 2006 r. Wpłaty przyjmują urzędy pocztowe na terenie woj. podlaskiego i oddziały „Ruch” na terenie całego kraju.
2. Cena prenumeraty na IV kwartał 2006 r. wynosi 28,00 zł.
3. Cena kwartalnej prenumeraty z wysyłką za granicę pocztą zwykłą — 120,00; pocztą lotniczą Europa — 133,00; Ameryka Płn., Płd., Środk., Afryka, Azja, Australia — 147,00. Wpłaty przyjmuje „RUCH” S.A., Oddział Krajowej Dystrybucji Prasy, ul. Jana Kazimierza 31/33, 01-248 Warszawa, Pekao S.A., IV O/Warszawa, Nr 68124010531111000004430494.
4. Prenumeratę można zamówić w redakcji. Cena 1 egz. wraz z wysyłką w kraju wynosi 3,50 zł, a kwartalnie — 49,00 zł; z wysyłką za granicę pocztą zwykłą: kraje europejskie — 5,00 (kwart. — 70,00), kraje pozaeuropejskie — 5,20 (kwar. — 72,80). Pocztą priorytetową: kraje europejskie — 6,00 (kwart. 84,00), Ameryka Półn., Afryka — 6,70 (kwart. — 93,80), Ameryka Połud. i Środ., Azja — 7,80 (kwart. — 109,20), Australia — 10,00 (kwart. — 140,00). Wpłaty: Rada Programowa Tygodnika „Niwa”, BPH PBK SA O/Białystok 77 1060 0076 0000 4011 5001 5504.

## 09.07 – 15.07

**Баран (21.03. — 19.04.)** Дзейнічаеш дынамічна і моцна. Лёгка ўдасца табе шмат дасягнуць. 13-15.07. можаш быць раздражнены, нервовы дома, не ўсё пойдзе па-твойму ў інтарэсах. Грошай не выдавай, а хутчэй іх талкова інвестуй.

**Бык (20.04. — 20.05.)** Могуць абвінаваціць цябе ў скупасці і блізарукасці. Абдумай усе рашэнні, каб пасля не шкадаваць памылак. Любоўнае расчараванне суцешыць прыліў грошай.

**Блізняты (21.05. — 21.06.)** Натужлівая ды плённая праца. Аформіш ключавыя справы і з дапамогай сяброў дасягнеш кожнай мэты. На працы сканцэнтруйся на сваіх абавязках. Вялікія эмоцыі і жарсці ў каханні.

**Рак (22.06. — 22.07.)** Можаш быць надта ўражлівы, злосны. Перачакай ненайлепшы час, пускай міма вушэй крытычныя заўвагі. Будзь асцярожны з 14.07., каб не ўзяцца за штосьці, да чаго зусім не надаешся.

**Леў (23.07. — 22.08.)** Можаш страціць веру ва ўласныя сілы і запал. Не паддавайся песімістычным думкам, бо хутка акажацца, што ў страху вялікія вочы.

**Дзева (23.08. — 22.09.)** Амаль увесь месяц не з усім паспееш на час (да 29.07.) і будзеш прывязваць вагу да малаважных спраў. Старайся думаць цвяроза, не паддавайся меланхоліі. Спадзявайся чароўных хвілін пры боку каханай асобы.

**Шалі (23.09. — 22.10.)** Можаш стаць ахвярай маніпуляцыі, падману, круцельстваў. Не давярай выпадкова пазнаным асобам, не паддавайся націскам. На свет глянеш праз ружовыя акуляры (каханне!). Ахвота выдаваць грошы шырокай рукой; можа, купіш нават аўто?

**Скарпіён (23.10. — 21.11.)** Твая бавітасць, рашучасць, нават адчай — непераўзыдзеныя! Вялікія поспехі ў прафесійнай кар'еры. Ды гэта можа выклікаць непрыязнасць атачэння і каментарыі, на якія ты не заслужыў. Ахвота кінуцца ў абдымкі камусьці шыкоўнаму.

**Стралец (22.11. — 21.12.)** Энтузіязм. На рахунку можа быць крыху больш, ды можаш разглянуцца за новай працай. На пагодлівым небе твайго сужонства могуць паявіцца чорныя хмары; зайздрасць можа быць атрутная!

**Казярог (22.12. — 19.01.)** Каляровае кампанейскае жыццё. Не раскідвайся грашыма! У час поўні Месяца будзеш празмерна ўзбуджаны, нервовы, твой кепскі настрой зносна перанясе партнёр; у яго сапраўды вялікае пачуццё гумару!

**Вадалей (20.01. — 18.02.)** Цяжкаватая атмасфера ў пары, маеш затое шанц прыспешыць прафесійны аванс. Слухай, што табе хоча сказаць партнёр! Хтосьці знаёмы можа табе яго пазайздросціць!

**Рыбы (19.02. — 20.03.)** Пачуцці падзьмуюць табе ў крылы. Будзеш ззяць у кампаніі. На жаль, на працы чакае цябе цяжкая праца. Да 12.07. вялікая інтуіцыя, суадчуванне, адкрытасць. Вельмі блізкія і сардэчныя вязі з бліжэйшай і далейшай сям'ёй. 10-14.07. будзеш вельмі падатлівы на ўнушэнні тых, хто цябе можа выкарыстаць. Не паддавайся крутым ідэям!

**Агата АРЛЯНСКАЯ**

**Міра ЛУКША**

### *Дождж*

*Чакае дажджу зямля,*
*Чакаюць дажджу расліны,*
*Сохне ў знямозе ралля,*
*Сухія пыляць каляіны...*

*І каня крычыць: „Дай піць!”,*
*І шпак сваю дзюбу разявіў...*
*Ды дзесьці ўжо гром грыміць,*
*Ветрык прабег па травах...*

*І першыя кроплі вады*
*Ўпусцілі хмары з сявенькі,*
*І дожджык пайшоў малады,*
*Спачатку дожджык маленькі,*

*Аж з неба лінуў сцяной,*
*Бы хмары ўпусцілі спадніцы,*
*А з неба адна за адной*
*Узрываліся бліскавіцы,*

*І гром грахатаў-рагатаў*
*Ад радасці, што аж знямог:*
*Што столькі з нябесных застаў*
*Вады даў на палі і мурог.*

## „Даўціпы”
### *Андрэя Гаўрылюка*

На забаве Янка прызнаецца дзяўчыне:

— Ты першая, у якую я закахаўся.

— Мне заўсёды не шанцуе, — уздыхае яна. — Зноў пачатковец.

* * *

У радзільным доме да знервавана-га мужчыны падыходзіць медсястра.

— Віншую вас, — звяртаецца да яго, — маеце другога сына.

— Вы хацелі сказаць: першага.

— Першага таксама.

## Адгаданка



1. працёртая маса з фруктаў або агародніны, 2. горы на мяжы Чэхіі і Баварыі, 3. плоскі драўляны палазок прымацаваны да абутку для перамяшчэння па снезе, 4. селянін у царскай Расіі, які прызначаўся дапамагаць паліцыі падтрымліваць парадак у вёсцы, 5. буйны нямецкі горад у басейне Рура на рацэ Вупер, 6. запрэжка, у якой коні або валы ідуць гужам ці парамі адна за адной, або швейцарскі горад і кантон на поўдзень ад Цюрыха, 7. Дэвід (Hume), англійскі філосаф (1711-76), 8. балгарскі ўладар, 9. родны горад Хрыстафора Калумба, 10. ашуканства, мана, 11. Томас (Kyd), англійскі драматург (1558-94), 12. грубае абмежаванне ў правах, прыгнёт, 13. ранішняя царкоўная служба, 14. сябар, прыяцель, 15. найвышэйшы пункт нябеснай сферы, 16. патаемна цвіце ў купальскую ноч.

**(Ш)**

Адгаданыя словы запісаць у вызначаныя дарожкі, пачынаючы ад поля з лічбай. У светлых палях атрымаецца рашэнне — афарызм Кларэнса Дэраў.

Сярод чытачоў, якія на працягу месяца дашлюць у рэдакцыю правільныя рашэнні, будуць разыграны кніжныя ўзнагароды.

**Адказ на адгаданку з 22 нумара**

Мармур, калгас, кумыс, Тураў, футбол.

Рашэнне: **Круглы стол.**

Кніжную ўзнагароду высылаем **Лукашу Пацэвічу** з Беластока.

ISSN 0546-1960